Пралетарыі усіх краёў, з...

Савецкая Беларусь

Органа Цэн...ага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 1 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: ізнагародзін — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок капарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьцепкам на 50 проц. даражэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАКС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. пастоках. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 91 (2580) Аўторак, 23-га красавіка 1929 г.

154кр. "Савецкая Беларусь" ОДЕССА, Пастера, 13 Дзярж. Публічн. бібліят. студз. сьнежань адзін экз.

СЁНЬНЯ АДЧЫНЯЕЦЦА XVI усесаюзная партканфэрэнцыя.

Масква, 22-IV. 23-га красавіка а 6 гадзіне ўвечары адчыняецца XVI усесаюзная партканфэрэнцыя.

ЗАВОД „КРАСНЫЙ ВЫБОРЖЕЦ"—XVI ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ

ЛЕНІНГРАД, 20-4. Рабочыя «Красного Выборжца» накіравалі XVI ўсесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі рапарт, у якім паміж іншым пішуць: «Верныя заветам Леніна, мы, 4500 рабочых і служачых «Красного Выборжца» у сакавіку бягучага году выклікалі на сацыялістычнае выпярэдніцтва па зьніжэньню сабекошту ўсе фаблрыкі і заводы СССР. Мы з радасьцю адзначаем, што па нашаму выкліку сацыялістычнае выпярэдніцтва распачалі ўжо сотні фабрык і заводаў. *Штодня тэлеграмы даносяць, што лік удзельнікаў сацыялістычнага выпярэдніцтва расьце і ахапляе ўсю краіну. На гэтых днях мы перамаглі на гаспадарчым фронце, атрымаўшы першы савецкі алюміні з сваёй сыравіны. Гэта—буйная перамога, якая дасталася нам шляхам доўгай упартай працы. У будучым мы яшчэ мацней будзем змагацца за вызваленьне нашай краіны ад капіталістычнай залежнасьці.* Рапартуючы і вітаючы XVI партыйную канфэрэнцыю, мы, рабочыя і служачыя «Красного Выборжца», заяўляем, што ўсе пастановы будуць праводзіцца намі ў жыцьцё з жалезнай упартасьцю і настойлівасьцю".

Правал рэпарацыйных перамоў з Нямеччынай выклікае замяшаньне

Францыя пагражае рэпрэсіямі Нямеччыне.

ПАРЫЖ, 20-4. Афіцыйны друк выказвае надзею на магчымасьць працягу рэпарацыйных перамоў, даючы зразумець, што нямецкі ўрад павінен для гэтага адмежавацца ад «палітычных» заяў Шахта (аб калёніях і аб усходніх границах Нямеччыны), ці даць яму новыя інструкцыі. Пры гэтым газэты заяўляюць, што «Францыя не дапусьціць, каб рэпарацыйныя перамовы былі выкарыстаны дзеля перагляду мірных дагавораў».

Афіцыёзны друк паведамляе далей, што „робяцца новыя захады", для папярэджаньня зруйнаваньня камісіі экспэртаў, а таксама, што Морган і Оўэн Юнг у гутарцы з Шахтам выказалі зьдзіўленьне наконт занятай ім пазыцыі і папярэджалі яго «аб згубных для Нямеччыны эканамічных і палітычных вынніках разрыву».

З свае боку Шахт заявіў прадстаўніку газэты „Журналь": „Я ніколі не казаў, што апошнія прапановы Нямеччыны зьяўляюцца апошнім словам нямецкай дэлегацыі. Я ніколі не глядзеў на камісію экспэртаў, як на рынак для барацьбы паміж попытам і прапановай. Мае апошнія прапановы складзены ў тым-жа духу, што і прапановы дзяржаў-кредытораў. Яны зьяўляюцца адной з стадыі доўгай лікоўай спрэчкі, якую мы распачалі не мінулымі тыдні. Я заўсёды выказваў самае гарачае жаданьне дасягнуць поўных вынікаў і заўсёды казаў, што пакіну камісію апошнім. Я гатоў абмяркоўваць усе прапановы, якія дзяржавы-кредыторы маглі-б высунуць у адказ на мае прапановы. Крытычныя водгукі, якія я знайшоў сёньня ў парыскім друку, яьляюцца ў поўнай меры прадчаснымі".

Правы друк, у адказу ад афіцыёзнага, усклада адказнасьць за заявы Шахта на нямецкі ўрад і рашуча патрабуе, каб перамовы былі спынены, і каб камісія экспэртаў у сваім заключным дакладзе адзначыла, што «прычынай зрыву перамоў зьявілася поўная неадпаведнасьць палітычных патрабаваньняў Шахта». Пры гэтым правыя газэты зусім не шкадуюць аб крыўдным, па іх думцы, зруйнаваньні камісіі экспэртаў і заўважаюць, што перамовы, на даўшы ніякіх вынікаў, прымусяць дзяржавы-кредыторы настойліва дамагацца дакладнага выкананьня пляну Дауэса, хоць-бы цаною новых эканамічных і палітычных рэпрэсій у адносінах да Нямеччыны; такая палітыка, водгук якой прагавала друку, будзе тым больш неабходнай, чым менш можна разьлічваць на гатоўнасьць Злучаных Штатаў „аказаць нажым на Нямеччыну". Адначасова правыя газэты заяўляюць, што «палітыка франка-нямецкае зьліжэньня, расчачатая Зрыў, скончыцца поўным крахам».

Чарговы крок да новых войнаў".

ЛЁНДАН, 21-4. Абмяркоўваючы крызіс рэпарацыйных перамоў, «Сэндэй Уоркер» піша, што парыскі тупік не павінен нікога дзівіць.

«Сапраўдная мэта немцаў—піша ён,—гэта перагляд вэрсэльскага дагавору. Саюзныя дзяржавы станоўча далі зразумець, што дагавор ня будзе пераглядзіцца, што яны ня думаюць разбройвацца і разьлічваюць захаваць сваё панаваньне сілаю. Парыскі крах і нямецкі тупік нішто іншае, як чарговы крок да новых войнаў».

Экспэрты радзяцца.

ПАРЫЖ, 20-4. Шахт і Юнг учора і сёньня раніцою радзіліся па розных пытаньнях. Такім чынам, канфэрэнцыя не зьяўляецца канчаткова спыненай. Розныя дэлегацыі ўжываюць сур'ёзныя захады да аднаўленьня перамоў.

Едуць у Бэрлін на нараду

БЭРЛІН, 20-4. Шахт і другі вямецкі экспэрт Фоклер выяжджаюць сёньня ў Бэрлін для дакладу ўраду інравядуць у Нямеччыне некалькі гадзін, бо павінны вярнуцца ў Парыж у пяньдзелак раніцой.

У САЮЗЕ ССР.

Прывітаньне т. Сталіну ад рабочых ст. Перм.

ПЕРМ. 21-IУ. Рабочыя станцыі Перм 2-й паслалі т. Сталіну ліст у якім пішуць: „Табе, правадыру нашай партыі, у дзень адчыненьня канфэрэнцыі, мы пасылам сваё рабочае прывітаньне. Галоўнае, тав. Сталін, барыся за тэмп індустрыялізацыі. Цяжкасьці ў нас вялікія, але мы згодны на ўрэзну колькаснага ўзроўню: няхай нам цяжка, але дзецям будзе добра. ЦК партыі і табе, т. Сталін, мы абяцаем самае моцнае падтрыманьне. Абапіраючыся на рабочую руку, упэўнена вядзі краіну да камунізму".

У выпярэдніцтве ўдзельнічае 8000 рабочых.

БАКУ, 22-4. Рабочыя Баку ўступаюць у сацыялістычнае выпярэдніцтва. Рабочыя вадоду імя Дзяржынскага выклікалі на выпярэдніцтва рабочых адной з капальняў Данецкага басэйну. На буйных прадпрыёмствах Баку арганізуецца выпярэдніцтвы паміж цэхамі. Усяго на сёньнешні дзень у выпярэдніцтве прымаюць удзел звыш 8.000 рабочых.

Мерапрыёмствы для зьмяншэньня прагулаў.

РЫБІНСК, 21-4. Для зьмяншэньня прагулаў і прастояў варштатаў і рабочых у Рыбінскіх галоўных вагонабудаўнічых майстэрнях уводзяцца адначасовыя перапынкі для гуляючых і нягуляючых (толькі для рабочых, атрымліваючых зарплату памесячна). Перапынкі будуць рабіцца кожную гадзіну (на 8 хвілін).

Выпярэдніцтва на лепшае правядзеньне сяўбы.

КУРСК, 21-4. Курскі гарсавет выклікае гарсаветы Варонежу, Тамбова, Арла і Белграда на лепшы плян рабочага памяшканьня, лепшую падрыхтоўку да будаўнічага сэзону, якасьць будынкаў і жыльлёвага будаўніцтва.

У вёсках Воцкай вобласьці пачалося выпярэдніцтва на лепшае правядзеньне вясеньняй сяўбы. Шэраг сяленьняў падпісалі паміж сабою дагаворы. Актыўны ўдзел у выпярэдніцтве прымае камсамол.

25.000 руб. за лепшыя вынікі выпярэдніцтва.

БРАНСК, 22-4. Бранскі губэрскі зьезд саветаў вызначыў прэмію ў 25000 руб. прадпрыёмству, якое дасьць найлепшыя вынікі пры сацыялістычным выпярэдніцтве.

СЯЛЯНСТВА ЗА АГРАМІНІМУМ.

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 21-IУ. У выніку растлумачэньня сялянам выгад аграмінімумаў мерапрыёмстваў у сучасны момант 1.800 паселішчаў (28 проц. усіх селішчаў губэрні) прынялі аграмінімум.

Арганізавана 148 новых калгасаў.

Тав. Пяткоў—старшыня дзяржбанку СССР.

МАСКВА. СНК СССР вызваліў Шэйнмана ад абавязкаў старшыні праўленьня Дзяржбанку СССР, назначыўшы замест яго старшынёю праўленьня т. Пяткова. ЦВК СССР вызваліў Шэйнмана ад абавязкаў намесьніка Наркома Фінансаў СССР.

Тыраж 10-ціпроц. выйгрышнай пазыкі.

Учора адбыўся 9-ты тыраж 10-ці проц. выйгрышнай пазыкі 1927 г. Выйгрыш у 50 тысяч руб. прыпаў на аблігацыю № 092717 сэрыя 15. Выйгрышы ў 25 тысяч руб. прыпалі на наступныя аблігацыі сэрый: аблігі. № 029191 сэрыя 16, абл. № 104987 сэрыя 16. Выйгрышы ў 10 тысяч рублёў прыпалі на наступныя №№ аблігацый і сэрый: абл. № 053451, 145.341, 1154506, сэрыя 07-19 Нумары аблігацый 068387, 151183, сэрыя 02-20.)

Жэнеўская камісія супроць разброеньня

„Камісія стаіць на адным месцы і ня ў стане рухацца далей, нават па намечаных ёю самою шляхох".

Дэклярацыя савецкай дэлегацыі.

ЖЭНЕВА, 20-4. Пасьля прыняцьця „меркаваньняў" прэзыдыуму падрыхтоўчай камісіі па разброеньню, Лёўдон, спаслаўшыся на канец спрэчак, адмовіў Літвінаву ў слове для заявы. У зьвязку з гэтым дэлегатам камісіі была перададзена дэклярацыя Літвінава. Дэклярацыя сьцьвярджае, што савецкія прапановы не галасаваліся, хоць прэзыдыум сам даў заключэньне аб поўнай адпаведнасьці пытаньняў савецкай дэлегацыі з паўнамоцтвамі і характарам працы камісіі. НЕКАЛЬКІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ, ПРЫСЬВЯЧАНЫХ АБМЕРКАВАНЬНЮ САВЕЦКАГА ПРАЭКТУ, НЕ ДАЛІ НІЯКІХ ВЫНІКАЎ, ЯК МІЖ ІНШЫМ І ЎСЯ ЧАЦЬВЕРТАЯ, ПЯТАЯ І ШОСТАЯ СЭСІІ ПАДРЫХТОЎЧАЙ КАМІСІІ, НА ЯКІХ НЯ БЫЛО ЎХВАЛЕНА НІВОДНАЙ СТАНОЎЧАЙ ПАСТАНОВЫ, ХОЦЬ НА АДЗІН КРОК ПРЫБЛІЗІЎШАЙ ВЫРАШЭНЬНЕ ПРАБЛЕМЫ РАЗБРОЕНЬНЯ. Адхіліўшы савецкія праэкты, камісія не дае ніякіх праэктаў, па якіх магла-б з якой-небудзь карысьцю працягваць працу. Ацэнка працы 3-х сэсій падрыхтоўчай камісіі, дадзеная савецкай дэлегацыяй, цалком пацьвярджае пэсымізм і недавер'е, з якімі савецкі ўрад прыняў запрашэньне Лігі Нацый удзельнічаць у падрыхтоўчай камісіі. КАМІСІЯ СТАІЦЬ НА МЕСЦЫ І НЯ Ў СТАНЕ РУХАЦЦА ДАЛЕЙ НАВАТ ПА НАМЕЧАНЫХ ЁЮ САМОЮ ШЛЯХОХ. АДЗІНЫМ ВЫНІКАМ ПАДРЫХТОЎЧАЙ КАМІСІІ АКАЗВАЕЦЦА ТОЛЬКІ ЗАЦЯГВАНЬНЕ НА ДОЎГІ ЧАС СПРАВЫ РАЗБРОЕНЬНЯ, АЛЬБО ПАДРЫХТОЎКА ПРАВАЛУ КАНФЭРЭНЦЫІ.

У канцы ў дэклярацыі гаворыцца: «сьцьвярджэньне гэтых фактаў павінна было-б прымусіць савецкую дэлегацыю на ўдзельнічаць больш у падрыхтоўчай камісіі. Калі, аднак, савецкая дэлегацыя пастанаўляе застацца, дык па тых меркаваньнях, каб нікому не даваць поваду прыпісваць бескарысьнасьць як падрыхтоўчай камісіі, так і самой канфэрэнцыі. Савецкая дэлегацыя застаецца ў падрыхтоўчай камісіі ў надзеі, што ўрады пад націскам грамадзкай думкі, галоўным чынам, рабочых арганізацый, палічаць сябе прымушанымі згадзіцца калі не на поўнае разброеньне, дык на значнае скарачэньне ўзброеньняў. У гэтым выпадку прадстаўнікі падрыхтоўчай камісіі наўхільна прымушаны будуць зьвярнуцца да савецкіх прапаноў, якія да гэтага часу адхіляліся, выконваючы інструкцыі сваіх урадаў.

Жэнеўская камэдыя працягваецца

Выступленьні савецкай дэлегацыі выклікаюць спалох

ЖЭНЕВА, 20-4. На сэсіі падрыхтоўчай камісіі па разброеньню здарыўся наступны інцыдэнт: Лёўдон абвяшчае, што ён хацеў бы выказацца па пытаньні абмену інфармацый аб узброеньнях, а таксама па пытаньні аб працэдуры працы камісіі. Лёўдон спасылаецца на тое, што дыскусіі аб нямецкіх прапановах ужо скончана, і пытае камісію, ці хоча яна выслухаць Літвінава. Літвінаў заяўляе, што калі кожны раз, як савецкая дэлегацыя хоча выказацца, неабходна спачатку ставіць на галасаваньне пытаньне аб тым, ці дазволае ёй камісія выступіць, дык ён у падобных выпадках адмаўляецца ад слова.

Паколькі гэта зьяўляецца на першай спробай грубага жаданьня перашкодзіць выступаць савецкай дэлегацыі, многія прысутнічаючыя на сэсіі выказваюць меркаваньне, што ўсё гэта сьведчыць аб намеры поўных колаў падрыхтоўчай камісіі правакаваць савецкую дэлегацыю на тое, каб яна пакінула пасяджэньне сэсіі, «моцна абурыўшыся». Камісія ўхваляе шэраг параграфаў аб забароне хімічнае вайны, супадаючых з прынятай і ратыфікаванай 13-ю дзяржавамі, у тым ліку і СССР, міжнародай канвэнцыяй.

Потым выступае Кешэндэн, які пярэчыць супроць параграфу, што забаранае выраб сродкаў хімічнай вайны ў мірны час.

Тав. Літвінаў прапануе замяніць гэты параграф адпаведным артыкулам адхіленага савецкага праэкту, які дугледжвае поўнае зьнішчэньне ... толькі сродкаў, але таксама прыладаў і апаратаў хімічнай вайны ў працягу 3 месяцаў пасьля набыцьця моцы канвэнцыі.

Пасьля шэрагу абмяжоўваючых тлумачэньняў тэксту, прапануемага камісіяй, яго канчатковая распрацоўка, зразумела, адкладваецца. Пры абмеркаваньні наступнага параграфу, прадугледжваючага забарону ўвозу і вывазу сродкаў хімічнай вайны, Кешэндэн робіць агаворкі, аналёгічныя папярэднім. Літвінаў прапануе не адкладаць меры барацьбы з хімічнай вайной да прыняцьця канвэнцыі аб скарачэньні ўзброеньняў і прыняць рэзалюцыю, патрабуючую ад усіх урадаў ратыфікаваньня ўжо існуючай канвэнцыі.

На вялікую прыкрасьць кіраўнікоў камісіі, дэлегаты Італіі, Турцыі, Нямеччыны і Японіі далучаюцца да прапамовы Літвінава.

Потым Лёўдон адкладае далейшую працу сэсіі да пяньдзелка ўвечары.

Рэальныя прапановы савецкае дэлегацыі

ЖЭНЕВА, 22-4. Савецкая дэлегацыя прадставіла праэкт рэзалюцыі аб хімічнай вайне. Рэзалюцыя прапануе выкінуць пункт праэкту канвэнцыі Лігі Нацый аб адмаўленьні ад хімічнае і бактэрыялёгічнае вайны, бо яна паўтарае жэнеўскі пратакол 1925 г. Савецкая дэлегацыя прапануе ўсім дзяржавам, якія яшчэ не ратыфікавалі жэнеўскі пратакол, ратыфікаваць яго ў найбліжэйшы тэрмін. Усім дзяржавам, падпісаўшым пратакол, савецкая дэлегацыя прапануе падпісаць дадатковы пратакол, згодна якога: 1) усе сродкі і прылады для хімічнае і бактэрыялёгічнае вайны, якія знаходзяцца ў войсках, у запасе і ў вытворчасьці, зьнішчаюцца ў працягу 3-х месяцаў з дня ўвядзеньня пратаколу ў жыцьцё; 2) у той-жа тэрмін скарачаецца выраб сродкаў хімічнага нападу і бактэрыялёгічнай вайны; 3) на вытворчасьці, якія могуць быць скарыстаны для вырабу сродкаў хімічнае і бактэрыялёгічнае вайны, прафсаюзамі арганізуецца сталы рабочы кантроль для абмежаваньня магчымасьцяй парушэньня пратаколу.

Замежная прэса—аб выніках працы камісіі разброеньня.

ТАКТЫЧНЫ ПОСЬПЕХ САВЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ.

БЭРЛІН, 20-4. Абмяркоўваючы спрэчкі па савецкім праэкце падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі па разброеньні, дэмакратычная «Бэрлінэр Тагеблят» падкрэсьлівае тактычны посьпех савецкай дэлегацыі, заяўляючы, што камісія прымушана была прызнаць прынцып адчуванага скарачэньня ўзброеньняў і не магла проста ўхіліцца ад савецкага праэкту, але павінна была прыняць пастанову аб перадачы яго канфэрэнцыі па разброеньні.

Напыналіская «Крэйццайтунг» гіранічна піша: «Падрыхтоўчая камісія атрымала перапынак. Горкая савецкая чаша мінавала яе. Толькі некалькі кропель савецкага віна засталіся ў разбройваючай вадзічцы. Савецкі праэкт, разам з яго трыма асноўнымі прынцыпамі, адсунут. Усё падсоўваецца генэральнай канфэрэнцыі па разброеньні: няхай яна над гэтым мучаецца. Ужыць больш рашучыя захады камісіі перашкодзіла лёгіка фактаў, упліў грамадзкай думкі і небясьпека, што савецкія дэлегаты могуць зачыніць за сабою дзьверы. Не апошнюю ролю адыграў тут таксама і спалох перад тым, што куля абурэньня магла-б нанесьці руйнуючы ўдар II Інтэрнацыяналу» (які падтрымлівае падрыхтоўчую камісію і Лізе Нацый).

Належыць адзначыць, што сацыял-дэмакратычная «Форвэрц», наперакор вялікай, таксама крытыкуе адносіны падрыхтоўчай камісіі да савецкага праэкту. Газэта піша: «Вялікія дзяржавы і іх паслугачы перашкодзілі абмеркаваньню савецкага праэкту, але Літвінаву ўдалося пакazаць большасьці падрыхтоўчай камісіі, што яна ўтойвае свае сапраўдныя думкі і ня хоча прыняць шкарлія практычныя мэтады працы па разброеньні».

ЗАМАЗВАЮЦЬ ПРАВАЛ КАМІСІІ.

БЭРЛІН, 20-4. Афіцыёз міністэрства замежных спраў «Дэйчэ Дыпляматыш-Палітышэ Карэспандэнт» выступае ў абарону сучаснай сэсіі падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі па разброеньні, бачачы ў яе працы падставы для некаторых „надзей". Гэтыя падставы афіцыёз спрабуе знайсьці ў пастанове аб абмеркаваньні нямецкага мэмарандуму, у прамове лёрда Кешэндэна і нават у адносінах камісіі да савецкага праэкту. Афіцыёз паўтарае заявы кіраўнікоў падрыхтоўчай камісіі аб тым, што савецкі праэкт на мог быць пакладзен у аснову яе працы, бо яна, камісія, не павінна сама распачынаць скарачэньне ўзброеньняў, але павінна толькі дасьледаваць для будучай канфэрэнцыі па разброеньні праэктуемыя падрыхтаваньні". Пры гэтым афіцыёз, наперакор відавочнасьці, заяўляе, нібы савецкі праэкт не адхілен камісіяй і нібы «меркаваньне» прэзыдыуму камісіі наконт праэкту «у асноўным задаволіла, нават, аўтараў савецкіх прапаноў».

Па думцы палітычных колаў, гэтыя заявы „Дэйчэ Дыпляматыш-Палітышэ Карэспандэнт" адбіваюць імкненьне некаторых колаў нямецкага міністэрства замежных спраў да зьліжэньня з палітыкай кіраўнікоў падрыхтоўчай камісіі; аднак, нельга лічыць, што афіцыёз адбівае ў даным выпадку сапраўдныя думкі шырокіх палітычных колаў Нямеччыны.

Бастуе 4 тысячы батракоў.

ПРАГА, 20-4. На вінаградніках Беразоўскага раёну (Закарпацкая Украіна) некалькі тыдняў ужо цягнецца забастоўка 4 тысяч батракоў. Усе спробы гаспадароў і ўлады прымусіць рабочых вярнуцца на працу не далі ніякіх вынікаў. Па загаду ўлады была справакавана стычка паміж жандармэрыяй, якая спрабавала зьняць рабочыя пікеты, і масай рабочых, якія выступілі на абарону пікетчыкаў. Жандары страляілі ў натоўп і арыштавалі 65 рабочых. Усе паведамленьні аб гэтых падзеях у камуністычнай прэсе канфіскаваны.

Удзельнік забойства Лібкнэхта—супрацоўнік судовага ведамства.

БЭРЛІН, 21-IУ. Пасьля двухдзённага перапынку адноўлена слуханьнем справа рэдактара радыкальнага штотыднёвіка «Тагебух», узьнятая пракурорам Ёрасонам, прыналежнасьць якога да забойства Лібкнэхта і Розы Люксэмбург была выкрыта часоніцам.

На апошнім пасяджэньні суду выкрыцьцё часопісу атрымала новае пацьверджаньне. Цэнтрам увагі былі паказаньні намуністычнага дэпутата Піка, які ў студзеньскія дні 1919 году быў арыштаваны разам з Лібкнэхтам і Люксэмбург і толькі дзякуючы шчасьліваму выпадку на быў забіты.

Пік падрабязна апавядаў суду аб тым, што адбывалася ў штабе контр-рэвалюцыйнай улады, і канстатаваў, што галоўную ролю ў забойстве выгрывалі капітан Пабт, Гартунг і салдат Рунге. Вялікую сэнсацыю выклікала зьўленьне нібы загінуўшага важнага сьведкі Ліпмана. Ліпман—былы афіцэр, ён камандаваў партаю, якая суправаджала Лібкнэхта. У сучасны момант ён служыць у прускім судовым ведамсьцьве. Ліпман прызнаўся, што ён страляў, калі вялі Лібкнэхта, але страляў ён нібы-та ў паветра.

„Ротэ Фане" называе скандалам тое, што пасьля выкрыцьця ў прыналежнасьці да забойства Ліпман служыць в ведамстве ўлады ў прускім судовым ведамсьцьве.

Рэкордны палёт.

ПАРЫЖ, 20-4. Лётчыкі Байі і Рэжынансі прыляцелі 18-га красавіка ў Лебуржэ, заснаваўшы наветраную сувязь Францыя—Індакітай—Францыя, пакрыўшы без ніякіх здарэньняў адлегласьць у 24 тысячы кілёмэтраў у працягу 19 дзён, пры сярэдняй хуткасьці палёту 150 кілёмэтраў у гадзіну.

АДЗНАКІ ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ Ў ПОЛЬШЧЫ.

Хранічны дэфіцыт замежнага гандлю.

ВАРШАВА. Баланс замежнага гандлю ў Польшчы ў сакавіку даў дэфіцыт у 71.763 тысячы злотых. Прывезена тавараў на 233 міліёны руб., вывезена на 161 міліён. Гэты дэфіцыт у Польшчы робіцца хранічным зьявішчам. У студзені і лютым месяцы баланс быў таксама дэфіцытным. У студзені—на 79 міліёнаў руб., у лютым—на 96,5 міліёнаў. Побач з гэтым агалошаныя ў польскай прэсе лічбы замежнага гандлю сьведчаць аб вострым падзеньні апошняга, што відаць з наступных лічбаў: у студзені агульная лічба замежнага гандлю складала 510,6 міліёнаў злотых, у лютым —432,3 міліёны злотых, у сакавіку—394 Асабліва востра зьнізіўся польскі вываз, які ў студзені складаў 215,8 міліёнаў; а ў сакавіку—161,5 міліён.

Масавыя звальненьні лодзінскіх рабочых

Арышты і вобыскі ў Варшаве і Лодзі.

ВАРШАВА, 19-IУ. У лодзінскай тэкстыльнай прамысловасьці насьпеў новы крызіс. Цэлы шэраг фабрык абвясьцілі масавыя звальненьні рабочых. Другая частка фабрык абмяжоўвае вытворчасьць двума-трыма днямі ў тыдзень. АГУЛЬНАЯ КОЛЬКАСЬЦЬ ЗВОЛЬНЕНЫХ РАБОЧЫХ ДАСЯГАЕ ЎЖО 30.000. У рабочых масах скарачэньне вытворчасьці і масавыя звальненьні выклікаюць вялікае ўзбуджэньне. Надыходзіць шэраг мітынгаў і сходаў.

У Лодзі ў зьвязку з набліжэньнем 1-га мая зроблены буйныя арышты сярод моладзі.

Паміж іншым, арыштаваны сын вядомага дэпутата сойму Грынбаума, які зьяўляецца лідэрам яўрэйскай апазіцыі ў сойме.

У Варшаве палітычная паліцыя зрабіла вобыск у памяшканьні ППС—лявіцы. Пасьля вобыску арыштавана каля 20 чалавек, якія накіраваны ў турму. Яны абвінавачваюцца ў камуністычнай дзейнасьці.

Грашовы крызіс польскага рынку.

У сувязі з эканамічным становішчам і асабліва з рэзкім скарачэньнем вывазу на польскім рынку адчуваецца вялікі грашовы крызіс. Для ўзмацненьня прытоку грошай польскі банк падвысіў процант з 7 да 8 проц. Тое-ж зрабілі і прыватныя банкі, якія падвышаюць процант з 12 да 13, абгрунтоўваючы гэта тым, што прыклад польскага банку выклікаў патрабаваньні аб падвышэньні і з боку ўкладчыкаў гэтых банкаў.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку намесьнік старшыні банку Млынарскі растлумачыў гэта мерапрыёмства польскага банку наступным чынам:

„Як вядома, амэрыканскі рынак адчувае зараз недахват грошай. З гэтай прычыны амэрыканскія грошы паступова адцягваюцца з эўранейскіх рынкаў. Па гэтай прычыне назіраецца адліў іх і з Польшчы, што значна зьменшыла запасы польскага банку. Між тым атрыманьне новых крэдытаў сустракае ўсё большыя цяжкасьці.

Гаспадарчае разьвіцьцё нашай краіны грунтуецца на прытоку замежных капіталаў, якія моцна ўплываюць на наш рынак.

Зроблены крок польскім банкам—заяўляе далей Млынарскі—залежыць ад таго, ці пойдзе наша агульнагаспадарчая палітыка па спакойнаму шляху".

Зачыненьне капальняў.

Кіраўніцтва капальнямі «Хрысьціна», у якой занята 400 рабочых, абвясьціла аб тым, што яно мае намер у бліжэйшы час капальню зачыніць з тае прычыны, што яна дае страты. Аб будучым зачыненьні капальні пацьвердзіла таксама мясцовая ўлада.

Трэба адзначыць, што такое зачыненьне капальняў зрабілася ў апошні час досыць частым зьявішчам, бо ўласьнікі капальняў, у зьвязку з крызісам збыту, уважаюць за лепшае ўкладаць свае капіталы ў больш выгадныя прадпрыёмствы.

Напярэдадні новых эканамічных боек у Нямеччыне.

У шэрагу галін нямецкай прамысловасьці скончыўся тэрмін калектыўных дагавораў. Прадпрыёмцы ня выказваюць ніякай схільнасьці пайсьці насустрэч патрабаваньням рабочых пры падпісаньні новых калектыўных дагавораў. Наадварот, у шэрагу галін прамысловасьці капітал абвясьціў рашучы наступ на зарплату і ўмовы працы рабочых. Рабочыя пад кіраўніцтвам левай апазіцыі арганізуюцца для контрнаступу. Нямецкі пралетарыят уступае ў паласу новых эканамічных боек.

Металісты Бэрліну прад'явілі саюзу прадпрыёмцаў патрабаваньне павысіць зарплату ў сярэднім з 1,06 маркі да 1,20 маркі і скараціць лік разрадаў тарыфнай сеткі на 3. Прадпрыёмцы, аднак, рашуча адмовіліся павысіць зарплату хоць-бы на адзін пфэніг. Усе перамовы паміж прафсаюзам і прадпрыёмцамі не далі пакуль ніякіх вынікаў. Сваю адмову прадпрыёмцы матывуюць «цяжкім становішчам металюргічнай прамысловасьці, абцяжанай падаткамі, сацыяльнымі цяжарамі і інш.».

У адказ на адмову прадпрыёмцаў левая апазіцыя ў саюзе металістаў ухваліла пастанову мабілізаваць рабочых для барацьбы за свае патрабаваньні. Кіраўніцтва левай апазіцыі зьвярнулася да ўсіх ніізавых арганізацый з заклікам утварыць на мясцох баявыя камітэты і выбіраць дэлегатаў на канфэрэнцыю, якая склікаецца 21 красавіка. Гэта канфэрэнцыя абмяркуе шляхі і мэтады далейшай барацьбы.

У паласу рашучых стычак уступае таксама другі магутны атрад нямецкага пралетарыяту—гарнякі Руру. У зьвязку з неразаключэньнем калектыўных дагавораў рабочыя патрабавалі павышэньня зарплаты на 1 марку ў зьмену, а таксама паскораньня прасоўваньня моладзі на кваліфікаваную працу (забойшчыкаў і г. д.). Прадпрыёмцы ў сваю чаргу прад'явілі рабочым патрабаваньне ўстанавіць даваенны рабочы дзень (8 з паловаю гадзін для працуючых пад зямлёю). Побач з гэтым прадпрыёмцы пагражаюць 5 процантным зьніжэньнем зарплаты.

У некаторых капальнях ужо арганізаваны баявыя камітэты. У некаторых капальнях левая меншасьць правяла шэраг сходаў, на якіх абмяркоўваліся шляхі далейшай барацьбы.

Рабочыя пастанавілі дакладна падрыхтавацца да надыходзячых боек, якія могуць пачацца ўжо ў пачатку мая, калі канчаецца тэрмін калектыўнага дагавору.

Дзе-ні-дзе прадпрыёмцы прымушаны былі згадзіцца на ўступкі. Праўда, уступкі гэтыя нікчэмныя, а прапановы проста сьмешныя.

Так, напрыклад, у будаўнічай галіне прадпрыёмцы ў выкананьне пастаноў арбітражу згадзіліся павысіць у сярэднім на 5-7 пфэнігаў пагадзінную аплату. Гэтая прыбаўка ў 4-5 разоў ніжэй той, якую патрабавалі прафсаюзы. А рэфармісцкая верхвайна прыняла гэтае павышэньне як належнае, і на ім супакоілася. Адзінае левае крыло распачало падрыхтоўку да барацьбы за здаволеньне рабочых патрабаваньняў у поўным іх абхвапе. Гета крыху ўстрывожыла прадпрыёмцаў, якім не падабаецца пэрспэктыва рашучых выступленьняў агрэмаднай арміі будаўнікоў (1.400.000 чалавек).

Яшчэ большую пагрозу для прадпрыёмцаў уяўляе рух у хімічнай прамысловасьці. Прычыну гэтай трывогі яна цяжка адгадаць, калі ўлічыць, што хімічная індустрыя адна з найбольш магутных галін нямецкай прамысловасьці. Апрача таго, гэта прамысловасьць мае асабліва важнае значэньне ў зьвязку з тэй ролькю, якую яна будзе адыгрываць у надыходзячай вайне. У зьвязку з неразаключэньнем калектыўных дагавораў рабочыя патрабавалі павышэньня зарплаты на 10 пфэнігаў. Прадпрыёмцы адказалі на гэта рашучай адмовай.

Рух за зарплату праводзіцца ў сучасны момант, галоўным чынам, на мясцох пад кіраўніцтвам левых заводкомаў і прафупаважаных. «Тайная дыпляматыя» рэфармісцкіх лідэраў пры перамовах з прадпрыёмцамі паказала рабочым, што ім няма чаго чакаць ад сваіх прафсаюзных „правадыроў", і што яны павінны распачаць барацьбу сваімі ўласнымі сіламі пад кіраўніцтвам левай апазіцыі. Аўтарытэт левай апазіцыі сярод рабочых асабліва павялічыўся пасьля бліскучай перамогі левага крыла на выбарах у фабзавкомы.

Нездаволеньне рабочых хімічнай прамысловасьці выклікана нязвычайна цяжкімі ўмовамі працы. Нават водлуг афіцыйных даных рабочы дзень у гэтай галіне дасягае 9 і 10 гадзін. Ужываюцца зьдельныя і звышторміновыя работы. Нарэшце, у апошні час зрабіліся вельмі частымі выбухі, і значна ўзрос процант занядужэньня рабочых. Зарплата ў гэтай галіне надзвычайна нізкая. Тарыфная аплата вагаецца паміж 21 і 81,5 пфэнігаў у гадзіну.

У бліжэйшы час надыходзіць таксама абвастрэньне барацьбы рабочых берлінскага гарадзкога транспарту (трамвай, аўтабус, падземка) за павышэньне зарплаты на 15 пфэнігаў.

Працэс 35.

Адзін з абвінавачаных быў закатаваны і павешаны ў турме.

ВАРШАВА, 20-4. У Беластоку трэці дзень разглядаецца справа 35 асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У ліку абвінавачаных адзін—Райхман—памёр. Ён, згодна даных паліцэйскага пратаколу, быў знойдзен павешаным у адзіночай камэры, а водлуг заяў падсудных быў закатаваны ў часе допыту і потым павешан.

Працэс распачаўся дэманстрацыяй падсудных з прычыны забойства Райхмана. Учора, калі ў залі суду зьявіўся выкліканы старшын

III Акруговы Зьезд Саветаў Меншчыны.

БЮДЖЭТ МЕНСКАЙ АКРУГІ З 8 МІЛЬЁНАЎ РУБ. У 1927-28 Г. ВЫРАС ДА 12 МІЛЬЁНАЎ РУБ. У 1928-29 Г.—У БЛІЖЭЙШАЕ 5-ЦІГОДЗЬДЗЕ У РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ МЕНСКАЙ АКРУГІ БУДЗЕ ЎКЛАДЗЕНА 24 МІЛЬЁНЫ РУБ., З ЯКІХ 9.730.000 РУБ. ПОЙДЗЕ НА НОВАЕ БУДАЎНІЦТВА.—ДЛЯ РАЗЬВІЦЬЦЯ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ РАЗАМ З ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯЙ ПА 5-ЦІГАДОВАМУ ПЛЯНУ ПРАДБАЧЫЦЦА ЎКЛАДАНЬНЕ 14 МІЛЬЁНАЎ РУБ.

Бюджэт Менскай акругі.

Загадчык Менакрфа т. Вострыкаў зрабіў даклад аб стане бюджэту Менскай акругі.

Бюджэт Менскай акругі з 8 мільёнаў руб. у 1927-28 г. дасягнуў у 1928-29 г. 12 мільёнаў руб., г. ё. вырас на 30 проц. Па бюджэту мінулага году прыбытковая частка яго выканана на 98,61 проц. Падатковыя прыбытки складалі 52,5 проц., непадатковыя—36 проц. З гэтага відаць, што наш бюджэт, галоўным чынам, залежыць ад падатковых крыніц. У будучыне трэба звярнуць увагу на павялічэньне непадатковых крыніц. Падатковых прыбыткаў ня выканана на 171.000 руб. з прычыны ліквідацыі цэлага шэрагу прыватных прадпрыемстваў не даахрынана 273.000 руб. па непадатковых прыбытках.

Гаворачы аб бюджэце г.г., т. Вострыкаў звярачае ўвагу на тое, што як агульны, так і райённыя бюджэты значна вырасьлі, але бездэфіцытна бюджэты нельга зьвесьці. Дэфіцыт дасягае 1.386.000 руб. Шмат страты мае наш бюджэт з тае прычыны, што прыватны капітал хаваецца часта ў падпольлі. Фінансавыя органы ня могуць прасачыць, якія апэрацыі ён праводзіць. У гэтай паважнай задачы—выяўленьня неабкладзенага прыватнага капіталу—павінны дапамагчы фінансаваму апарату шырокія колы працоўных.

Шмат сродкаў недаатрымліваецца па бюджэту яшчэ і таму, што ня ўся пахата выяўлена. З 732.000 дзес. пахаты ў 1927-28 г. выяўлена толькі 76 проц., а ў гэтым годзе—79 проц.

Магутны ўздым рэспубліканскай прамысловасьці акругі.

(З ДАКЛАДУ ТАВ. КАРПА).

Прамысловасьць рэспубліканскага ваштабу акругі вырабляе прадукцыі ў год на 25 міліёнаў руб. У параўнаньні з мінулым годаў валавая прадукцыя вырасла на 24,6 проц. У сёлетнім годзе на капітальнае будаўніцтва акругі будзе затрачана 5.400.000 р. У бліжэйшае 5-цігодзьдзе на будаўніцтва і рэканструкцыю прамысловасьці акругі будзе затрачана звыш 24 мільёнаў руб.: на новае будаўніцтва—9.730.000 руб.; на рэканструкцыю і на пераабсталяваньне старых прадпрыемстваў—14 мільёнаў. Прадбачыцца пабудаваць 17 новых прадпрыемстваў. Асаблівая ўвага будзе зьвернута на пабудову прадпрыемстваў на выпуску будаўнічых, мэблявых, харчавых, кравецкіх фабрыкатаў, запалак і інш. Заводы «Энэргія» і «Камунар» маюць быць рэарганізаваны ў буйныя прадпрыемствы, якія будуць выраблваць варштаты і машыны. Пераход на гэты від работ павінен распачацца з бягучага году. Адначасна з гэтым у Менскай акрузе трэба будзе пабудаваць спэцыяльны рамонтны завод.

На лініі дрэваапрацоўчай прамысловасьці прадбачыцца пашырэньне заводу „Дрэваапрацоўчнік" у Менску і „Камінтэрн"—у Барысаве. Мяркуецца пераабсталяваньне шкляной гуты «Домбаль», яшчэ большае пашырэньне ф-кі „Чырвоная Баразіна", якая зараз дае прадукцыі ўтройчы больш, чым давалі ўсе запалкавыя ф-кі Барысава ў даваенны час.

Шырока разгортваецца кравецкая прамысловасьць. Сёлета адчыняецца ў Менску новая кравецкая ф-ка, арганізуецца скарняжная ф-ка. Галянтэрэйная вытворчасьць вырасла ў вялікую фабрыку. Мяркуецца пашырыць вытворчасьць абутку.

Дакладчык зварачвае ўвагу вэзду на тое, што наша прамысловасьць залежыць ад мясцовае сыравіны. Нам трэба дабіцца павялічэньня ўраджаяў бульбы, лёну ды інш. прадуктаў с.-г., каб мець сталую базу для разьвіцьця прамысловасьці.

Тав. Карп спыняецца на пытаньні павялічэньня вытворчасьці працы і зьніжэньня сабекошту. Зьніжэньне сабекошту па БССР у гэтым годзе павінна даць 1,5 мільёнаў руб. Трэба павесьці барацьбу з безгаспадарчасьцю, гультайствам і нядбайнасьцю. Гэта пытаньне мае глыбокі практычны характар. Нам не хапае сродкаў на будаўніцтва фабрык і заводаў. Тым часам нашы ф-кі і заводы да гэтага часу не дабіліся зьніжэньня сабекошту. На папяровай ф-цы «Прафінтэрн» нагадварот, павялічыўся сабекошт; заводы «Энэргія» і «Бальшавік» далі нязначнае зьніжэньне; «Пралетары»—даў 5,9 проц. зьніжэньня, «Домбаль»—3,6 проц. і г. д. Наша прамысловасьць павінна стаць на шлях рашучай барацьбы за зьніжэньне сабекошту.

Адначасова трэба заняцца палепшаньнем якасьці прадукцыі. Зараз у нас абвешчаны конкурсныя спаборніцтвы паміж паасобнымі прадпрыемствамі, цэхамі, брыгадамі. Мы павінны выявіць лепшых рабочых, лепшых майстроў, якім будуць выдавацца прэміі, іх будуць пасылаць у камандыроўкі, у экскурсіі, каб яны маглі яшчэ лепш удасканаліць свае веды.

Месца мясцовай прамысловасьці ў 5-ці гадовым пляне.

(З ДАКЛАДУ ТАВ. РАБІНОВІЧА).

У мясцовай прамысловасьці акругі варад занята 947 рабочых. У 27-28 г. мясцовая прамысловасьць выпрацавала ўсякіх тавараў на агульную суму ў 3 мільёны руб.; прыбытак яе за апошні год дасягае 115.000 руб. За апошнія 2 гады ўкладзена ў мясцовую прамысловасьць акругі 1.200.000 руб.

Па 5-цігадоваму пляну мяркуецца ўкласьці ў мясцовую прамысловасьць—разам з электрыфікацыяй—14.000.000 руб. з якіх: на новае будаўніцтва прамысловасьці—6 мільёнаў руб., на пераабсталяваньне старых прадпрыемстваў—1.170.000 руб. У канцы 5-цігодкі лік прамысловых прадпрыемстваў мае павялічыцца на 110 адзінак: 27 цагельных заводаў і 40 харчавых (алыноў, крахмальняў і інш.). Кошт прадукцыі мясцовай прамысловасьці ў канцы 5-цігодкі павінен дасягнуць 9.700.000 руб.

Укладаньне ў паасобныя галіны прамысловасьці мяркуецца: у харчовую прамысловасьць—2.600.000 руб., будаўнічую—2.522.000 руб. і тарфяную—1.200.000 руб. Калі летась у акрузе выпрацоўвалася толькі 7.500.000 цаглін, дык у канцы 5-цігодкі нашы цагельні павінны выпускаць 36 мільёнаў цаглін.

На будаўніцтва электрастанцый мяркуецца затраціць каля 7 мільёнаў руб. Апрача гарадоў, электрастанцыі мяркуецца пабудаваць і ў сельскіх мясцовасьцях. У канцы 5-цігодкі павінна быць электрыфікавана да 26.000 сялянскіх гаспадарак.

БЕЛАРУСЬ ПЕРАД СЯЎБОЙ.

Ачысьцілі 1363 пуды насеньня.

Вучні Губіцкай 2-хкамплектнай школы (Буда-Кашалёўскі р., Гомельскай акр.) сабралі 62 пуды попелу. Не адсталі і вучні лікпункту і школы малапісьменных, якія сабралі 50 пудоў.

Школа, лікпункт і школа малапісьменных прынялі шырокі ўдзел у кампаніі за ачыстку насеньня. У выніку губічане ачысьцілі 1363 пуды насеньня, што складае 90 проц. заданьня.

М. Блісьцікаў.

Гані-паганяй!

Сход пайшчыкаў сельска-гаспадарчага таварыства вёскі Багушоўкі, што зусім блізка каля Бабруйску, быў у поўным зборы. У чаканьні адчыненьня гутарылі аб апошніх навінах, падыходзячай вясьне і аб тым, што быццам усе газэты пішуць, што ў вёску прыедуць рабочыя з гораду, адчыняць свае майстэрні, арганізуюць калектывы і адбяруць усе лішкі зямлі ў сялян, што быццам закон ураду ёсьць на гэты конт за подпісам Калініна, Чарнякова і Троцкага, які зьвярнуўся

— Ды як-жа гэта?

Старшыня крэдытнага таварыства ня чуў слоў сялян, бо ён ужо быў за парогам, сьпяшаючыся бег да хаты, дзе брыўся, глядзеў у люстэрку, надзяваў новую вопратку і ўсё паглядаў у вакно чакаючы Красьнеўскага, які напоўна праводзіў такую-ж падрыхтоўку.

Прышоўшы Красьнеўскі паведаміў, што фурманка чакае каля варот, што ўжо болей дзесяці гадзін вечару, што трэба як мага сьпяшацца. Выбягалі з хаты, садзіліся на сані і, выкрыкваючы на ўсю вуліцу—гэй, Артамон,—гані—паганяй!—цешыліся з ног зьбіваючай шпаркасьцю каня, брудным сьнегам, што ляцеў на вокны сялянскіх хат і заўзята сьмяяліся з бабкі Аксіньні, якая, уцякаючы з дарогі пад страхам быць разьмятай канём, нязграбна распласталася на беразе растаяўшай канавы.

Заяжджалі ў вёску Боркі на вясельле да аднаго кулака, слухалі ветлівыя запрашаньні гасьцей —„проша, пані Сушынскі і пане Красьнеўскі," пілі самагон, кружыліся ў п'яным вальсе, дзякавалі гаспадара за цёплы прыём і зноў—«гэй, Артамон, гані—паганяй! —ехалі да Пагоцкага, у якога такая смачная яечня і моцны самагон, ветлае абыходжаньне і прыгожая дачка.

Няважна, што раніцою бабы ідуць за вадою да студні, знаходзяць забітага Красьнеўскага пад сьцяной с.-с. ... Не.не!.. Не забітага, а п'янага ў беспамяцтве... Парасяты бегаюць вакол ахвяры, а адзін, з больш спрытнейшых, нават за вуха спрабуе... Красьнеўскі пацягваецца ад нахлынуўшай млосьці і бесперастанку шэпча:—Альжуня... Альжуня... Не цалуйся...

... І ходзіць з таго часу крамнік крэдытнага таварыства карнавухім...

. . . . . .

Па сакрэту паведамляем ба бруйскіх таварышоў, што Красьнеўскі—сакратар камсамольскай ячэйкі, а Сушынскі сябра партыі і што едуць яны да шэрага дому з шыльдай «чыстка партыі», паганяючы п'янага каняку лікаманкавым—

— Гай, Артамон, гані-паганяй!

Цім. Зарэчны.

Сяляне вёсак Баршчоўка, Гомельскае акругі, ачышчаюць насеньне.

Увага „Ленінскаму шляху".

Калгас «Ленінскі шлях», у Клімавіцкім раёне, найбуйнейшы ў Беларусі калгас (звыш 1000 дзесяцін вялікі, 134 сямей), аб стварэньні якога ўжо падавалася ў „Сав. Бел.", рыхтуецца ўжо да таго, каб ужо вясною цалкам перайсьці на калектыўную працу.

Экстраным парадкам туды камандыраваны каморнікі, якія да выхаду сялян у поле скончаць неабходныя земляўпарадкаўчыя работы.

Зроблены захады да таго, каб калгас быў цалкам забясьпечан крэдытамі, насеньнем, угнаеньнем і машынамі. Калгасу дасцца трактар (наогул, заяўка акругі на трактары павялічана на 6 штук, у сувязі з арганізацыяй буйных новых калгасаў і ўзбуйненьнем старых).

Створана камісія для вылучэньня з Ветрынскага лясьніцтва кавалка лесу, які будзе перададзены калгасу як лес мясцовага значэньня, разам з балотным вучасткам сенажаці.

Зроблена ўказаньне райвыканкому аб перадачы калгасу млыну, які знаходзіцца на яго тэрыторыі.

Гэткім чынам новаму буйнаму калгасу ўжо з самага пачатку яго арганізацыі аддаецца належная ўвага.

К.

Праводзім кантрактацыю.

Чарэйскае с.-г. крэдыт. т-ва Аршанскай акругі пасьпяхова пакуль-што праводзіць кантрактацыю. Працаўнікі с.-г. т-ва шляхам выездаў на месца ў вёскі ў Савічанскім с.-с. за 2 дні закантрактавалі ільну-валакна і ільну-насеньня 18 гэктараў у 102 гаспадарках, з якіх: у 34 бядняцкіх, 66 серадняцкіх і 2 заможных. Сяляне ахвотна кантрактуюць пасевы.

Худаўскім калгасам «Залаты Рог» закантрактавана 2 гэкт. ільну-валакна, 2 гэкт. ільну-насеньня і 8 гэкт. аўса.

Наогул, трэба адзначыць, што кантрактацыя ў нашым раёне павінна прайсьці добра і кантрольныя лічбы па пляну будуць выкананы цалкам, калі ня здарыцца ў працягу далейшай працы, якіх-небудзь перашкод. Грошы на кантрактацыю, насеньне і ўгнаеньне ёсьць. Можа быць толькі недахват ільну-насеньня, якое акрсельсаюз усё-ж абяцаў даслаць. Трэба з кантрактацыяй падягнуцца калгасам Белаўаркоўскаму і Дударскаму.

Галавач Г.

З кантрактацыяй дрэнна.

(Магілеўская акруга).

Акрамя Шклоўшчыны, дзе праца па кантрактацыі ўжо пасьпяхова ідзе да канца, піводзін райён ня можа пахваліцца добрымі вынікамі. Па раду раёнаў (Бялыніцкі, Чаўускі, Чырвонапольскі, Прапойскі) толькі з пачатку красавіка ўскалыхнуліся, пасьля таго, як былі пасланы працаўнікі з акругі.

У якасьці тормазаў належыць падкрэсьліць наступныя моманты.

Папулярнай літаратуры для сялянства па кантрактацыі няма. Некаторыя крэдытныя таварыствы спрабавалі рассылаць по зэльсавэтах скарочаную інструкцыю Белсельсаюзу, але без асаблівай карысьці для справы, бо нават працаўнікі некаторых крэдытных таварыстваў яе, гэтай інструкцыі, не разумеюць і ня ведаюць, як тэхнічна падыйсьці да справы.

Райвыканкомы глядзяць на кантрактацыю, як на справу выключна крэдытае, а калі адзін райвыканком (Чырвонапольскі) вылучыў працаўнікоў для працы па кантрактацыі, дык апошнія проста не зьявіліся ў крэдытнае таварыства. Аграномы таксама ня лічаць кантрактацыю сваёй справай (пра гэта акрвыканком даў адпаведныя паказаньні райвыканкомам).

Затым, наглядаюцца непаразумеьні на мясцох і невыкананьне дадзеных паказаньняў.

Няясна ўяўляюць, што такое група-вая кантрактацыя, лічачы, што трэба кантрактаваць цалкам усе пасевы пасёлішча, між тым, як гэта датычыцца толькі кантрактацыі сартавога аўсу.

Лічаць, што ў паасобнага кантрактанта трэба кантрактаваць усю плошчу данай культуры (у сапраўднасьці толькі таварную частку).

Ёсьць няправільнасьць з выдачай авансаў. Па Чэрыкаўшчыне выдаюць аднальковыя авансы і бедняку, і серадняку, і заможнику, па другіх мясцох выдаецца аванс адразу цалкам (а ня 70 проц., як гэта належыць). Бывае, што кантрактуюць паасобна валакно і паасобна—семя, альбо толькі семя. Не дастаўляюцца своечасова справаздачы ў сельсаюз.

Агульная сума закантрактаваных пасеваў складае па акрузе больш за ўсё—па ільняным семю—35 проц., па валакну—24 проц., па канюшыне—13 проц., па астатніх культурах—ад 11 да 1 проц.

Задача неадкладная крэдытных таварыстваў—разгарнуць, як мае быць, працу, райвыканкомы павінны вылучыць для сталае працы сваіх работнікаў і агрономаў, каб пры дапамозе сельсаветаў і актыву скончыць у тэрмін на 100 проц. складаньне дагавораў, не забываючы якасьці працы, зьнішчаючы адзначаныя вышэй хібы і памылкі.

Квім.

Мітынг за ўраджай.

Чэрвень, 15-4. У нядзелю 14 красавіка чэрвенскай ячэйкай ЛКСМБ быў праведзен мітынг усёй гарадзкой моладзі за падвышэньне ўраджайнасьці. На мітынгу акрамя моладзі камсамольцаў, піянэраў, школьнікаў і некаторай часткі членаў саюзаў, дзякуючы вялікаму базару, прысутнічала шмат і сялян.

Дземяшкевіч.

ПРЫВІТАНЬНЕ УРАДУ БССР.

Ва ўмовах рашучага наступленьня на кулака і нэпмана, у час шпар росту сацыялістычных элемэнтаў гораду і вёскі сабраўся 2-гі акруговы зьезд ветаў Гомельшчыны вырашаць вялікую справу—справу сацыялістычна-гаспадар і культурнага будаўніцтва акругі.

Зьезд запэўньвае, што пастаўленыя задачы выканае з гонарам.

Пасылаючы сваё братэрскае прывітаньне, другі зьезд саветаў залуб кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ЦВН мы ўдзеваецерым сваю энэргію і о справе хутчэйшага будаваньня сацыялізму і дамо рашучы адпор усім тым, хт сягне на нашую працу да будаваньня сацыялізму. Разам з гэтым уцягнем пр ныя масы ў практычнае выкананьне прыняты зьездам пастаноў, узмацнім с і рэвалюцыйную законасьць, разгорнем самакрытыку і забясьпечым савецка-п тарскую дэмакратыю.

Нехай жыве КП(б)Б!

Нехай жыве Урад БССР!

ПРЭЗЫДЫУМ.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

АРГАНІЗАЦЫЯ ЦЭХУ ПА РАМОНТУ С.-Г. МАШЫН І ПРЫЛАДАЎ.

СНК пацьвердзіў пастанову Эканамічнай Нарады аб арганізацыі спэцыяльнага цэху пры віцебскім заводзе „Чырвоны Мэталіст" для рамонту с.-г. машын і прыладаў. ВСНГ запрапанавана распрацаваць пытаньне аб арганізацыі майстэрняў па рамонту с.-г. машын і прыладаў па лініі мясцовай прамысловасьці.

АБ ВЫДАЧЫ СРОДКАЎ НА КАНАЛІЗАЦЫЮ Г. МЕНСКУ.

СНК запрапанаваў НКФіну забясьпечыць выдачу сродкаў, прызначаных на каналізацыю г. Менску.

АБ ПАБУДОВЕ ДОМУ ЎРАДУ.

СНК устанавіў канчатковы тэрмін разгляду эскізных праэктаў Дому Ураду 10 ліпеня 1929 г.

СНК зацьвердзіў журы конкурсу ў наступным складзе: т. Сталінскі—старшыня савету журы, т. Гальдштэйн—ад камісіі СНК, т. Крузмат—ад Менскага гарсавету, інжынэр Краўзе—ад камітэту па будаўніцтву, праф. Падбярэзкі—ад Ленінградзкага архітэктурнага т-ва, праф. Рыльскі або архітэктар Грынберг—ад Маскоўскага архітэктурнага т-ва, архітэктар-мастак Гайдукевіч, інжынэр Навокін, прадстаўнікі: ад Беларускай Акадэміі Навук, прафсаюзу будаўнікоў і інжынэр Сахараў. Камісіі СНК даручана канчаткова разглядзець унутраннае размяшчэньне Дому Ураду, узгадніўшы папярэдне з зацікаўленымі ўстановамі.

Аслабленьне плошчы пад Дом Ураду і высяленьне жыхароў з будынкаў, якія знаходзяцца на гэтай плошчы, усклядзена на Менскі гарсавет і камісію СНК.

АБ ПАДВЫШЭНЬНІ КВАЛІФІКАЦЫІ АГРАНОМАЎ.

СНК прызнаў неабходным практыкаваць навуковых камандыроўкі агранамічнага пэрсаналу ў межах БССР для падвышэньня кваліфікацыі і вызначыў неабходныя сродкі на гэтую патрэбу.

АБ ВЫДАЬНІ МАСАВАЙ СЯЛЯНСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

СНК прыняў да ведама заяву БДВ і НКЗ аб тым, што частка прызначанае да выданьня літаратуры па сельскай гаспадарцы ўжо выдана, але са спазьненьнем.

НКЗ запрапанавана тэрміновa даць заяўку БДВ на выданьне сельска-гаспадарчай літаратуры ў межах зацьверджанага пляну. НКФ даручана забясьпечыць неабходнымі сродкамі выданьне масавай с.-г. літаратуры. СНК пастанавіў заслухаць 2 месяцы даклад БДВ і НКЗ аб выд с.-г. літаратуры ў гэтым годзе.

АБ ПАЛЕПШАНЬНІ ВЫДАНЬНЯ І ПРЫБЛІЖЭНЬНІ КНІГІ ДА ЧЫТАЧА.

СНК прыняў цэлы шэраг мерапрыемстваў да палепшаньня выданьня і прыбліжэньня кніжак да чытача. БДВ запрапанавана выдаваць кнігі, асабліва камуністычную літаратуру, у строга-плянавым парадку, максымальна скараціўшы тэрмін выданьня кніг. Выданьне кампанейскай літаратуры навінна праводзіцца так, каб атрымоўвалася візавой кніга-гандлёвай кампаніі. БДВ даручана наладзіць цесную сувязь з выдавецтвам РСФСР і інш. рэспублік і наладзіць справу так, каб ракладная палітычная літаратура з рускай мовы на беларускую выходзіла па чымасьці адначасова з расейскімі і іншымі выданьнямі, а таксама наладзіць сувязь з выдавецтвамі іншых рэспублік па выданьні ілюстраванай дзіцячай літаратуры, максымальна зьвяжыўшы кошт яе. Ведамсьцьная і вузка-спэцыяльная літаратура павінна выдавацца пераважна за кошт зацікаўленых ведамстваў. Значна павінна быць палепшана і пашырана рэклама кніжкі і друк і іншыя мэтады, прадугледжваючы трэбныя выдаткі на гэтую мэту пры с. даньні гадавых каштарысаў. Штогод у г вых каштарысах БДВ трэба ўлічваць спэцыяльныя выдаткі на патанэньне ўсіх відаў савай, дзіцячай літаратуры і падручні для школ і вышэйшых навучальных ноў. БДВ запрапанавана прыступіць выданьня таннай мастацкай літаратуры, якая разьлічана на шырокія колы чыў-рабочых і сялян, і дабіцца максымальнага зьніжэньня сабекошту кні праз большую рацыяналізацыю выдавчасьці і памяншэньне накладных выдаткаў.

Бяручы пад увагу, што кошт кніг нацыянальных мовах, якія выдаюцца Б вельмі вялікі, а таму мала даступны ронім колам чытачоў, СНК даручыў Б і Камітэту па Справах Друку распрацаваць пытаньне аб магчымасьці патанэньня цэнтралізацыі выданьня гэтых кніг. Для паскораньня прасоўваньня кнігі спажыўца НК РСІ даручана вывучыць пытаньне аб рацыяналізацыі таваразрас ной сеткі БДВ і даць адпаведныя дырэктывы кніга-гандлюючым арганізацыям. Д падвышэньня кваліфікацыі працаўні кнігагандлёвай сеткі і для падрыхто новых працаўнікоў з ліку рабочых, лян-беднякоў, батракоў, БДВ і Белкаап ю даручана правесьці ў бягучым го спэцыяльныя курсы на падрыхтоўцы і ракваліфікацыі кніжных працаўнікоў.

У ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЗЕ БССР.

АБ МЕРАПРЫЁМСТВАХ ДА ПАШЫРЭНЬНЯ ВЫРАБУ БУДАЎНІЧЫХ МАТАР'ЯЛАЎ.

Будаўніцтва кожнага году высоўвае ўсё большыя запатрабаваньні ў будаўнічым матар'яле, чым выклікаецца неабходнасьць у пашырэньні вырабу іх. У зьвязку з гэтым ВСНГ БССР прыняў захады, каб намечаны ім плян будаўніцтва цагляных заводаў у 1928-29 г. быў выканан поўнасьцю. Дзеля гэтага Эканамічная Нарада запрапанавала таксама ўсім АВК, каб астатнія прынялі меры да поўнага выкананьня праграмы будаўніцтва цагляных заводаў, намечаных у 1928-29 г.

Адначасова з гэтым даручана ВСНГ БССР і ўсім АВК і РВК высьветліць наліччa бязьдзейнічаючых прадпрыемстваў па вырабу будаўнічых матар'ялаў; пры наяўнасьці астатніх перадаць іх у працягу месяца бясплатна прамысловым, кааперацыйным арганізацыям, якія аб'яднае Беларускі Самат.-Прамысл. Саюз з усім прамысловым інвэнтаром і абсталяваньнем. Перадачы не падлягаюць толькі тыя з бязьдзейнічаючых прадпрыемстваў, пуск якіх прадугледжваецца ў бягучым годзе вытворчымі праграмамі рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці.

Самат.-Прамысл. Саюз абавязан прыня тэрміновыя захады да хутчэйшай прыёмкі гатых прадпрыемстваў і пуску іх.

Для фінансаваньня саматужных прамысловых арцеляў выдзяляецца Белсампрасаюзам 136 тысяч рублёў уласных сродкаў і крэдыт Белсельбанку ў суме 25 тыс рублёў. Даручана ВСНГ абмеркаваць пытаньне адносна магчымасьці фінансаваньня Бел. Сам.-Прам. Саюзу ў суме 1 тысяч рублёў за сродкаў ВСНГ і свае п пановы ў тыдзёвы тэрмін падаць у Эканамічную Нараду.

АБ ЦЭНАХ НА ПЛУГІ.

Пры разглядзе пытаньня пра ўстаналеньне цэн на плугі вырабу Белмэтальтрэсту Эканамічная Нарада пры СНК БССР згадзілася з тым, што для палегчаньня с ляству набыцьця плугоў, а таксама і бол шага іх прасоўваньня ў вёску для бядн шай часткі насельніцтва гандлюючымі а ганізацыямі зроблена зьніжэньне на плуг Адпускная каштоўнасьць кожнага плу незалежна ад яго сыстэмы паніжаецца 50 кап.

У мэтах далейшага паніжэньня цэн плугі Эканамічная Нарада даручыла Гандлю д сканала прапрацаваць гэта пытаньне.

Гомельцы рыхтуюцца да I-га мая.

Гомель, 16-4. У дні сьвяткаваньня 1-га маю будуць арганізаваны масавыя гульні для рабочых і служачых, 2 мая фізкультурнікі будуць дэманстраваць свае дасягненьні. На плацох будуць наладжаны кіно-сэансы. 30 красавіка, 1 і 2 мая ва ўсіх кіно-тэатрах будуць кіно-сэансы для чырвонаармейцаў. Ва ўсіх школах і клюбах будуць наладжаны дзіцячыя ранішнікі.

У сельскіх мясцовасьцях у дні 1 ма будуць дэманстрацыі пад лёзунгам „узьняць ураджайнасьць, за калектыўізацыю сельскай гаспадаркі, за барацьбу з п'янымі рэлігійнымі сьвятамі" 4, 5 і 6 мая, калі будзе добрае па двор'е, будзе наладжана сьвята „1-шы дзень баразны".

Узмацнім папулярызацыю дасягненьняў сельскае гаспадаркі праз кіно.

З неабходнасьцю шырокай агрэпрапаганды ў зьвязку з задачай павышэньня ўраджайнасьці ніхто спрашацца ня будзе. Пры агульнай увазе да агрэпрапаганды мэтады яе да гэтага часу пераважна старыя, а якасьць агрэпрапаганды яшчэ і дагэтуль на надта нізкім узроўні. Пытаньне аб якасьці агрэпрапаганды бязумоўна ў бліжэйшы час прыцягне ўвагу агранамічных працаўнікоў, палітасьветпрацаўнікоў і ўсіх устаноў, якія ў першую чаргу павінны праводзіць агрэпрапаганду. Нас у даным выпадку цікавіць пытаньне аб скарыстаньні новых мэтадаў агранамічнае прапаганды, якія былі б больш дасканалымі ў параўнаньні з старымі. Не адмаўляючы значэньня спэцыяльных агранамічных гутарак, шырокіх сялянскіх канфэрэнцый, друку (газэты, спэцыяльная сельска-гаспадарчая масавая літаратура, плякаты лістоўкі) ны, аднак, думаем, што скарыстаньне для агрэпрапаганды кіно можа даць непараўнальна больш значныя вынікі. У гэтым напрамку за межамі зроблена шмат чаго. У справе скарыстаньня кіно для агрэпрапаганды ў замежных краінах ёсьць ужо багаты вопыт: асабліва за апошняе 10-цігодзьдзе. Аб значэньні кіно, як сродку ўплыву на масы, у нас ведаюць добра але аб скарыстаньні кіно для мэт агрэпрапаганды да гэтага часу прынамсі на Беларусі пытаньне яшчэ ня ставілася. Практыка замежных краін, у прыватнасьці Нямеччыны, гаворыць, што там кіно з посьпехам канкурыруе як з сельска-гаспадарчай літаратурай, так і з рознымі відамі агрэпрапаганды.

Ва Ўсходняй Прусіі скарыстаньне кіно для мэт агрэпрапаганды вельмі пашырана. За апошнія 10 год там выдана некалькі сот сельска-гаспадарчых фільм, выдана шмат літаратуры па пытаньню мэтодыкі складаньня сцэнарыяў для сельска-гаспадарчых культур-фільмаў, выданы практычныя падручнікі па працы з кіно ў вёсцы, у сельска-гаспадарчых школах і г. д. Уся гэтая праца праводзіцца спэцыяльна ўтвораным камітэтам па справах сельска-гаспадарчага кіно. Нядаўна выданая кніжка Клейнганса *) падрабязна апісвае, што зроблена Цэнтральным камітэтам на справах сельска-гаспадарчага кіно ў галіне агрэпрапаганды. Аўтар прыводзіць думку шэрагу вучоных Нямеччыны аб тым, што ў справе сельска-гаспадарчае асьветы і прапаганды кіно мае неабмежаваны прастор. Па думцы гэтых вучоных, у даным выпадку ўплыў кіно значна большы за ўплыў друку ці дыяпазытываў. З дапамогай фільму магчыма з большым посьпехам паказаць тыя працэсы, якія адбываюцца ў прыродзе, і даць магчымасьць хутчэй зразумець гэтыя працэсы. Сельска-гаспадарчыя фільмы дапамагаюць устанаўленьню сувязі гораду з вёскай. Гарадзкі жыхар мала знаёмы з працэсамі работы ў сельскай гаспадарцы. Дэманстрацыя сельска-гаспадарчых фільм у гарадох дапамагае, асабліва гарадзкой моладзі, азнаёміцца з палажэньнем сельскае гаспадркі і з працай вясковага жыхара. Скарыстаньне для прапаганды фільмаў, у якіх паказваюцца ўзорныя гаспадаркі, праца дасьледчых станцый і г. д., больш карысна, чымся апісаньне гэтых гаспадарак у друку. Былі выпадкі, калі пад уплывам кіно-фільму сяляне ў бліжэйшы час наладжвалі экскурсіі дзеля таго, каб паглядзець на тыя ці іншыя гаспадаркі, якія яны бачылі толькі на малюнках. У кніжцы дадзена шмат практычных парад, як арганізаваць пракат сельска-гаспадарчага фільму, пачынаючы ад выбару памяшканьня і экрану і канчаючы тым, як трэба класьці фільм у апарат.

Кіно-перасоўка ў Нямеччыне таксама вельмі пашырана. Аўтар спыняецца падрабязна на прапагандзе праз кіно пры дапамозе арганізацыі кіно-перасоўкі. Шмат месца прысьвечана пытаньню выбару кіраўніка кіно-перасоўкі, як чалавека, які павінен праводзіць агрэпрапаганду, якому даюцца надта каштоўныя матар'ялы—фільм, апаратура і г. д. Пры пісаньні сцэнарыя рэкамэндуецца навуковыя даныя камбінаваць з якім-небудзь цікавым сюжэтам, каб надаць фільму бялетрыстычную форму. У фільму павінны сустракацца сцэны з камічнымі момантамі ці прыгожымі відамі. Зьмест фільму павінен быць выключна навуковы і абгрунтаваны на праверэных дасьледчымі станцыямі матар'ялах. Раней, чым выпусьціць фільм у грамадзкае карыстаньне, робіцца афіцыйна прагляд яго у цэнтральным камітэце па справах сельска-гаспадарчага кіно. Пасьля прагляду фільму ў камітэце ён прагледваецца яшчэ ў спэцыяльнай камісіі з прадстаўнікамі сельска-гаспадарчых арганізацый, школ, міністэрства асьветы, міністэрства народнага харчаваньня і асобнымі спэцыялістамі тае галіны сельскае гаспадаркі, якой прысьвечаны фільм. Большая частка кніжкі напоўнена апісаньнем лепшых сельска-гаспадарчых фільмаў, якіх прыводзіцца каля 300. Дзеля таго, каб уявіць сабе маштаб працы агрэпрапаганды праз кіно, дастаткова пералічыць колькасьць фільмаў, выпушчаных па асобных пытаньнях сельскае гаспадаркі: па каняводзтву—27, па буйнаму рагатаму жывёлаводзтву—22, па аўцаводзтву—16, па сьвінаводзтву—17, па малочнай гаспадарцы і птушніцтву—20, па рыбаводзтву, пчалярству і разьвядзеньню футраных зьвяроў—15, па сэлекцыі і насеннаводзтву—30, па вінаробству, садоўніцтву і гародніцтву—15. Акрамя гэтага, вельмі многа фільмаў выпушчана па пытаньнях лесаводзтва, культуры балот, сельска-гаспадарчых машын, барацьбы з сьмяцёвымі расьлінамі, барацьбы са шкоднікамі (прыблізна каля 100 фільмаў). Шмат фільмаў прысьвечана пытаньням працы сельска-гаспадарчых школ, гурткоў, арганізацыі выставачнай справы і г. д.; аднаму толькі пытаньню ўгнаеньня прысьвечана 35 фільмаў. Гэткая колькасьць тлумачыцца вялізарным значэньнем мінеральнага ўгнаеньня ў нямецкай сельскай гаспадарцы. Большасьць фільмаў для таго, каб яны больш лёгка захапілі гледачоў, пераплецена з якім-небудзь рамантычным сюжэтам. Чыста навуковых фільмаў выдана значна менш. Адначасова шмат фільмаў мае чыста гумарыстычны характар.

Цяжка, канешне, перадаць зьмест кнігі Клейнганса, ды гэта і не ўваходзіць у нашыя задачы. Белдзяржкіно павінна будзе паклапаціцца набыць гэтую каштоўную і цікавую кнігу дзеля таго, каб азнаёміцца з дасягненьнямі замежных краін у гэтай справе. Было-б добра, каб адначасова Белдзяржкіно паклапацілася набыць 2-3 сельска-гаспадарчыя фільмы з Нямеччыны, каб працаўнікі Белдзяржкіно і спэцыялісты сельскае гаспадаркі маглі практычна азнаёміцца з асобнымі фільмамі і з пастаноўкай гэтае працы за мяжою. Плян Белдзяржкіно, складзены ў мінулым годзе, ня мог, зразумела, прадугледзець тыя запатрабаваньні, якія зараз стаяць перад ім у галіне агрэпрапаганды. Аднак, падняцьце ўраджайнасьці і задачы рэканструкцыі сельскае гаспадаркі настойліва вымагаюць ад Белдзяржкіно перагляду гэтай часткі свайго пляну, з мэтай значнага яго пашырэньня. Правільней было-б скласьці новы плян сельска-гаспадарчых фільмаў, бо пытаньням агрэпрапаганды ў сваім 5-гадовым пляне Белдзяржкіно ня вызначыла амаль ніякага месца.

**Зразумела, для гэтага патрэбны сродкі і ня мала сродкаў, і ўскласьці ўсю цяжкасьць гэтае працы на Белдзяржкіно было-б вялікай памылкай. Тут у першую чаргу сродкамі павінны дапамагчы тыя гаспадарчыя арганізацыі, на абавязку якіх ляжыць разгортваньне агрэпрапаганды, узьняцьце ўраджайнасьці, узмацненьне кааперацыі і калектывізацыі і г. д. Белсельтрэст, Калгассаюз, Белсельсаюз, НКЗ, мясцов

НА ФРОНЦЕ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

АГНІ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ ЗАЬЛОНЯЦЬ ТУСКЛЫ СЬВЕТ ВЯЛІКОДНЫХ СЬВЕЧАК.

...ЁЗУНГІ ДА АНТЫ-...ЛІКОДНАЕ КАМ-ПАНІІ.

...снавым абліччам Хрыста прыкрываецц... ...ораг савецтаў. Ты ня можаш быць у ...шэрагах. Уступай саюз бязбожні-...

...ні рэлігійныя путы. Ідзі ў шэрагі баз-...жнікаў.

...рацоўны, ідучы па заветах рэлігіі, ты ...зволі падтрымліваеш свайго мясавага ...ага!

...ызнаваць шкоднасьць рэлігіі—недас-...ова. Трэба павесьці змаганьне з ёю. ...ставіся ў шэрагі бязбожнікаў.

...е ніверуючыя—у шэрагі таварыства ...ожнікаў.

...вучы рэлігійныя путы, уваходзячы ў ...з бязбожнікаў, мы ўзмацняем кадры ...ўнікоў сацыялізму.

...лянін-бязбожнік, першы праводзь на ...м полі ўсе мерапрыёмствы для ўзь-...ня ўраджайнасьці

...мсновы бязбожнік павінен быць пачы-...нікам у справе калектывізацыі сель-...і гаспадарні.

...ніруем рабочую самакрытыку су-...ць неахуцтва і п'янства, рэлігійных за-...ноў і антысэмітызму.

...а наступ папоў і сэктантаў адкажам ...нізацыяй саюзу бязбожнікаў.

...сьлехі ў барацьбе з рэлігіяй—восьне-...а культурным фронце.

...атрабуйце вялікдзенныя дамы і цэр-...пад культурныя вачэры.

...будуйце ньвярозы новы быт без рэлігіі ...і алкагольнай атруты.

...ераможам культурай рэлігію і алка-...ь.

...змацнім фронт барацьбы з рэлігіяй.

...елігійнае выхаванньо—злачынства су-...ць дзяцей.

...лей ад папоў і сэктантаў, бліжэй да ...туры і асьветы.

...робам кулакоў і сэктантаў камяцца ...народнай цэмры супроцьпаставім куль-...ную масавую работу.

...елігія і алкаголь—вораг культурнае ...люцыі.

...супроць рэлігійна-п'янага мора, супроць ...гулаў і прастоў машын, за метазгод-...і напружаную працу, за здаровы ад-...ынам.

...ходнае пралетарское навейні на га-...ку і рэлігію.

...змацнім наступленьне на п'янства, рэ-...і антысэмітызм.

...аботніца і сялянка! Разам рэлігійныя ...ы. Будуйце новы быт!

...рэч агэнтаў буржуазеі—папоў, раві-...ніндзоў і ўсіх іншых царкоўных ...хвасьняў.

...рэч наймітаў капіталу — царкоўнікаў ...і гатункаў.

...а новы быт, супроць п'янства і рэлігіі. ...ьвесьмі у быту піўную і малінькенны ...на чырвоную чайную, клюб і кіно.

...а рэлігійныя забабоны і папоўскія за-...і адкажам узмацненьнем антырэлігій-...ай працы.

...ой, хто сьвяткуе вялікдзень, падтрым-...е рэлігійны дурман.

...змагаючыся супроць рэлігіі розных га-...ункаў, узмацняйце інтэрнацыянальнае вы-...ваньне працоўных.

...ерабудуем быт на новы лад. Прэч з ...у працоўных рэлігійныя сьвяты, малу, ...ны, п'янства і інш.

...рэч клерыкалаў, прыхвасьнаў буржуа-...

...рэч апошні аплот буржуазеі — рэлігію ...і гатункаў.

...ьлікідуем навісьменнасьць — глебу ...ры і рэлігіі.

...рэч сьвяткаваньню вялікдня—праяву ...ванага супрацоўніцтва. Нахай жыве ...ая—сьвята клясавае барацьбы

...ньвялізм—контр-рэвалюцыйная сіла. ...трыманьне клерыкалізму зьвяўляецца ...трыманьнем клясавага ворага.

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ БЯЗБОЖНІКАЎ БЕЛАРУСІ.

Вялікдзень і Першае Мая.

Сьвята вялікдзень—найвялікшае з эксплёататарскіх сьвят. Гэта «сьвята сьвятаў» зьяўляецца найвялікшым таму, што як ніякае іншае, яно ўкараняе ў думку веруючых ідэю клясавага сьвету. „Адзін другога абымем, даруем усе грахі"—вось цэнтральная ідэя вялікдня. Буржуазея не шкадуе сродкаў, каб гэту выгадную ёй і варожую працоўным ідэю ўкараніць у сьвядомасьць усіх членаў капіталістычнай грамады.

Новы сьвет мае свае сьвяты. Сьвяты сацыялістычныя—гэта сьвяты рэвалюцыйныя, сьвяты, заклікаючыя да барацьбы з эксплёататарскім сьветам, да згрупаваньня сіл працоўных, да іх сусьветнага аб'яднаньня.

Адным з найбольш вядомых, папулярных сьвятаў працоўных усяго сьвету зьяўляецца сьвята Першага Мая. Гэта—сапраўднае сьвята працоўных, сьвята барацьбы і перамогі над капіталам.

На адной постай частцы зямное кулі, у СССР, перамога працы над капіталам—зьявішча ўжо праведзенае ў жыцьцё. Пагэтаму і сьвята 1 Мая ў Савецкім Саюзе—асабліва радаснае, масавае, папулярнае, народнае сьвята.

У дзень 1 Мая нашы рабочыя і сяляне падлічваюць свае дасягненьні, аглядаюць шлях, пройдзены ў барацьбе, намячаюць шляхі будучай працы, шляхі дапамогі сваім братом на Захадзе і Ўсходзе.

Але не аджыў у Савецкім Саюзе яшчэ і стары сьвет.

Ёсьць яшчэ ў СССР буржуазныя, дробнабуржуазныя, антысавецкія элементы. Для іх Кастрычнікавая рэвалюцыя—востры нож у сэрца. Гэтыя элементы бароняць свае сьвяты—старыя, рэлігійныя.

Сьвята вялікадня і сьвята 1 Мая сёлета амаль што супадаюць. Стары сьвет праз свае сьвяты, такім чынам, адкрыта сутыкаецца з новым сьветам.

Зразумела, на вялікдзень будзе яшчэ шмат народу ў царквах. На вялікдзень шырокаю ракою пацячэ яшчэ п'янка, хуліганства, распуста, мордабіцьце, адным словам—усе тыя прыгоды, якімі так вызначаліся раней і вызначаюцца зараз рэлігійныя сьвяты. На вялікдзень будуць гаварыцца ялейныя казаньні на тэму «о любви к брату во христе», аб тым, каб не забываць царства божага і менш клапаціцца аб зямных справах. Усё гэта будзе. Але ўсё гэта будзе актам самаабароны буржуазных рэшткаў ад пераможнага ходу сацыялістычнага будаўніцтва.

Сапраўдным народным сьвятам працоўных ня толькі Савецкага Саюзу, але і ўсяго сьвету, зьяўляецца сьвята 1 Мая. Якімі-б бражджоткамі ні ўпрыгожваўся вялікдзень, першамайскія ўрачыстасьці сваёй прастатой, сваёй масавасьцю, сваім рэвалюцыйным энтузіязмам засланяць яго канчаткова.

Ф. О.

Школа штурмуе неба.

(Круглянская сямігодка, Аршанскай акр.)

— Антырэлігійная праца ў Круглянскім раёне ідзе па-кампанейску. Мы павінны зараз-жа разьвінуць антырэлігійную прапаганду, падрыхтоўваць масы да вяліканьня так, каб вяліканьне ў нас зьявілася днём падагуленьня праробленай працы ў барацьбе супроць рэлігіі,—так сказала школьная рада круглянскай сямігодкі па пытаньню аб супроцьвялікоднай падрыхтоўцы.

Кожны настаўнік атрымаў сабе вёску, у якой павінен правесьці даклады на антырэлігійныя тэмы. Настаўнікамі ахоплены і ўсе саюзныя арганізацыі, прычым асабліва ўвага зьвернута на прапаганду сярод жанок служачых.

Дзеля вядзеньня штодзённай антырэлігійнай прапаганды мабілізаваны сілы гуртка «Бязбожніка», які працуе пры школе. Пад яго кіраўніцтвам і павінна праводзіцца ўся антырэлігійная праца.

Вучням дадзена заданьне падняць працу вясковых гурткоў «Бязбожніка», а таксама арганізаваць новыя гурткі і быць іх кіраўнікамі. Праводзіць працу ў савгасах і калгасах па арганізацыі «сьвята першай баразны». Вучням камсамольцам дадзена заданьне падрыхтаваць да гэтага сьвята вясковую моладзь, моладзь калгасаў і савгасаў.

Камсамолец Барздоўн ў в. Замышках арганізаваў вакол сябе гурток «Бязбожніка» з сялян і займаецца з імі кожны дзень.

Вучням з вёсак дадзена заданьне распаўсюдзіць на вёсцы 65 экземпляраў газэты „Бязбожнік".

Міхась Дзергачоў.

МЭЛАМЭД АШКІНАЗІ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКІМ СУДОМ.

(Чавусы, Магілеўскай акругі).

24 сакавіка г. г. у пакаяньвані Чавускага народнага выяздная сэсія Магілеўскага акружнога пацыянальнага суда пад старшынствам т. Эстэркіна пры перапоўненай залі слухала справу грамадзяніна г. Чавус Ашкіназі на абвінавачаньню яго па 159 арт. Кр. Код.—за ўтрыманьне без дазволу прыватнай школы. Гр. Ашкіназі зьяўляецца мэламэдам - прафэсыяналам. Да 20 году ён займаўся гэтай працай і ня спыняў яе і пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі. Сыстэматычна вёў працу сярод бацькоў і дзяцей і бязупынна арганізоўваў групы і вёў рэлігійнае навучаньне на старажыдоўскай мове. У гэтыя групы ўваходзілі дзеці ад 6 да 10 год, і тыя дзеці, якія адначасова наведвалі нашу працоўную школу.

Гр. Ашкіназі ў студзені месяцы быў выяўлен райённым інспэктарам асьветы, ён і даставіў суду падручнікі, на якіх ішло навучаньне.

Ашкіназі даводзіў, што рэлігійнасьці ён не навучаў, што патрэбна і карысна навучаць мове дрэўня-яўрэйскай. Ён лічыць, што стара-яўрэйская мова ёсьць мова жывая і неабходная для практычнага ўжываньня і ссылаўся на тое, што ў Францыі і Амэрыцы выдаюцца газэты на стара-яўрэйскай мове.

Перад судом прайшло шэраг сьведак, у ліку якіх былі настаўнікі яўрэйскай сав. школы. Апошнія давялі суду, што вучні школы, якія адначасова наведваюць хэдэр, адстаюць у навучальна-выхаваўчай справе і што ўсё тое, што гэтыя дзеці вывучаюць у нашай працоўнай школе, руйнуецца працай гр. Ашкіназі.

Далей сьведкі давялі, што выкладаньнем стара-яўрэйскай мовы грам. Ашкіназі перашкаджае вучням у вывучэньні практычных момантаў працы, а рэлігійная праца яго сярод дзяцей зьвяшчае тыя матар'ялістычныя пачаткі, якія закладваюцца дзецям у працоўнай школе.

Суд прыгаварыў гр. Ашкіназі да 6 месяцаў зьняволеньня, але прыгавар палічыў умоўным у працягу 2-х год.

Працэс значна дапамог у працы сярод клерыкальнага элементу гораду. Школам належыць яшчэ больш інтэнсыўна павесьці працу сярод бацькоў і насельніцтва па растлумачэньню шкоднай дзейнасьці рэлігійнікаў.

Дабравольскі.

Зноў трэба ўздараўляць і рацыяналізаваць.

(Справы Інстытуту сацыяльнага перавыхаваньня).

Інстытут сацыяльнага перавыхаваньня па сваіх задачах і мэтах зьяўляецца надзвычайна адказнаю і цікавою ўстановаю. Такога тыпу ўстановы арганізуюцца для цяжка-выхоўваемых дзяцей. Да дзяцей цяжка выхоўваемых адносяцца такія катэгорыі, якія, папершае, пад уплывам доўгага ўзьдзейнічаньня на іх няспрыяючага псыхафізычнага і сацыяльнага асяродзьдзя адхіліліся ў паводзінах ад нормы і гэтыя колькасныя адхіленьні перайшлі ў якасьць, і, падругое, такія, у якіх дрэнныя паводзіны зьявіліся вынікам паталёгічных спадчынных фактараў. Інстытут шляхам выхаваўчага працэсу павінен дрэнныя якасныя асаблівасьці ў цяжка-выхоўваемых дзяцей замяніць станоўчыні і зрабіць з гэтых дзяцей «нармальных».

Вось такая ўстанова, адзіная на ўсю Беларусь маецца ў Крынках, Бабруйскай акругі. Крынкаўскі Інстытут сацыяльнага перавыхаваньня калісь-та быў ня дрэннаю ўстановаю, але з цягам часу недахопы ў Інстытуце сталі перавышаць станоўчыя бакі і адпаведным органам трэба было ўзяцца за аздараўленьне ўстановы.

Прайшло дзевяць месяцаў з таго часу, як зроблены былі радыкальныя зьмены ў кіраўніцтве Інстытутам, як дадзена было шэраг паказаньняў аб паляпшаньні працы, рацыяналізацыі апарату і г. д., аднак становішча інстытуту не палепшылася, калі нават не пагоршылася за гэты час.

Трэба адзначыць, што паставіць выхаваньне ў Інстытуце на належную вышыню вельмі цяжка. Неабходна мець вельмі кваліфікаваны кадр працаўнікоў, якія маглі-б шляхам медыка-пэдагагічнага ўзьдзейнічаньня перавыхаваць асобу і зрабіць яе сацыяльна карыснаю для грамады. Хто-ж гэтаю вельмі важнаю справаю займаецца ў Інстытуце?

У мінулым годзе НКА прапанаваў загадчыку запрасіць на працу ў Інстытут урача-пэдалёга. Між тым, да апошняга часу гэта прапанова ня выканана і замест урача-пэдалёга працуе ў Інстытуце нейкі Волаш, ротны фэльчар, які ня мае нават права на самастойную медычную практыку.

І вось гэты Волат, які з сваёю спэцыяльнасьцю можа загнаць чалавека на той сьвет, вядзе «псыхалёгічныя» і «пэдалёгічныя» досьледы, лечыць дзяцей ад розных хвароб і адначасова загадвае майстэрнямі Інстытуту. Словам, шэвц, кравец і на дуду ігрэц.

Але ўсё гэта было-б паўбяды, каб Волаш ня быў горшым п'яніцаю, ня спаіваў супрацоўнікаў і каб з яго ня бралі прыклад дзеці. Выхаванцы кажуць—супрацоўнікі п'юць, чаму-ж нам ня піць, чым мы горшыя за іх? Па заяве жонкі былога супрацоўніка Інстытуту Янушэўскага, які недзе зьнік, у Волаша і рукі ня чыстыя: ён прадаў клюбную гітару і мандаліну, ён, як добры сябра Янушэўскага, які хацеў пазбавіцца сваёй жонкі, даў апошняй сулемы, каб яна атруцілася.

А вось яшчэ працаўнікі інстытуту. На пасаду выхавацеля прызначаны брат загадчыка навучальнай часткі Інстытуту—Сьцяпан Карповіч, які скончыў толькі 7-хгодку і ніякага ня мае вопыту ў працы. Далей, сябра саюзу Хэймана як інструктара кравецкай майстэрні звальняюць, а на яго месца прызначаецца селянін Колас, ня член саюзу, які мае сваю гаспадарку і які ўмее шыць толькі кажухі. Вось гэты дык мусіць навучыць выхаванцаў быць краўцамі.

Можна было-б прывесьці яшчэ шэраг фактаў аб неадпаведнасьці працаўнікоў Інстытуту, але і гэтага досыць, каб адпаведным установам тэрмінова заняцца справаю перагляду складу працаўнікоў Інстытуту.

Як-жа абстаіць справа з выхаваўчаю справаю ў Інстытуце? Трэба адзначыць, што катэгорыя цяжка-выхоўваемых дзяцей патрабуе правільнай арганізацыі быту, точнай рэгляментацыі дню, надзвычайнай арганізаванасьці працоўных працэсаў, што дае магчымасьць упарадкаваць рэакцыйную дзейнасьць дзяцей. Між тым у Інстытуце адсутнічаюць правілы ўнутранага распарадку і ня выпрацаваны да апошняга часу правы і абавязкі супрацоўнікаў Інстытуту. У выніку такой працы, адміністрацыі Інстытуту прыходзіцца выганяць выхаванцаў з установы за розныя ўчынкі, між тым як установа па сваіх задачах не павінна гэтага рабіць, а ўсю ўвагу сканцэнтраваць на перавыхаваньні дзяцей. Сярод дзяцей назіраецца п'янства, выпадкі педарастыі, невыкананьне распараджэньняў выхавацеляў, няўка на працу ў майстэрні і г. д.

Рэч вядома, што на настаноўцы выхаваўчай працы ў значнай ступені адбіваецца дрэннае матар'яльнае становішча Інстытуту, у выніку галоўным чынам безгаспадарчасьці. Так, напрыклад, будынак Інстытуту на зіму ня быў адрамантаваны і неабгледжаны, у выніку чаго печы некаторыя не паліліся, падвойных рам ня было, не абгледжаны былі дзьверы, не абклеены вокны, дзякуючы чаму дзеці цэлую зіму вельмі мерзьлі. У майстэрнях таксама вельмі холадна было. Гэта і адсутнічаньне цёплага адзеньня і спэцвопраткі ў дзяцей зьяўляецца асноўнаю прычынаю няўкі дзяцей на працу ў майстэрні.

Праблема працы і працоўнага выхаваньня цяжка выхоўваемых дзяцей зьяўляецца адным з цэнтральных пытаньняў усяе працы, а між тым вытворчых плянаў майстэрні ня маюць, адміністрацыя не паклапачаецца каб іх склаць.

Надзвычайна дрэнна абстаіць справа з абмундыраваньнем дзяцей. Амаль поўнае адсутнічаньне верхняй вопраткі ў дзяцей, а блізнаю таксама дрэнна, а абутку дык усе дзеці ня маюць. Зразумела, што пры такім становішчы ці можна гаварыць аб належнай пастаноўцы выхаваньня ў Інстытуце, калі для гэтага няма абсалютна ніякіх элемэнтарных абставін. Такое гаспадараньне, якое маецца ў Інстытуце, зразумела гэтых абставін ня ўтворыць.

Сапраўды, чаго здавалася-б больш трэба пры нашых наогул слабых матэрыяльных магчымасьцях, калі Інстытут атрымоўвае сродкі на бюджэту так, як і ўсе дзіцячыя ўстановы, мае гаспадарку, уласныя сьлясарную, сталярную і шавецкую майстэрні, мае вялікі млын у сваёй эксплёатацыі, а між тым дзеці не адзеты, не абуты, дрэнна харчуюцца і г. д.

Як назваць такое гаспадараньне, дзе прычына? Нам здаецца адна з двох прычын: ці людзі, якія кіруюць установаю, нягодныя, ці маюцца злачынствы. Трэба паглядзець, што робіцца ў Інстытуце і адшукаць прычыну, каб можна было ўсё-ж аздаравіць гэту вельмі каштоўную ўстанову.

Грашовае становішча Інстытуту надзвычайна дрэннае і ён ня выйдзе з гэтага становішча без спэцыяльнай дапамогі. Інстытут, дзякуючы «добраму» гаспадараньню, мае вельмі шмат завінавачанасьці: 5000 руб. Белсельбанку, 1730 руб. Цэнтразесскладу і цэлы шэраг дробнай завінавачанасьці, якая ўвогуле складае ўсё-ж значную лічбу. На пакрыцьцё некаторай часткі завінавачанасьці Інстытут абсалютна ня мае ніякіх крыніц.

Характэрна адзначыць для пацьверджаньня безгаспадарчасьці ў Інстытуце наступнае: рахункаводства ў Інстытуце заблытана, дапушчаны зьмены ў штатах, зацьверджаных НК РСІ і ў нармованых акладах, што парушае пастанову СНК, за асобнымі працаўнікамі лічацца значныя авансы, так, напрыклад, за заг. Інстытуту т. Таўбэ. 749 р. 47 к., за Бабарыкай 41 р., за Волашам у лік пэнсіі 96 руб. Мелася шэраг выпадкаў, калі грошы асыгноўваліся на якую-небудзь адну мету, а выдаткоўваліся зусім не па прызначэньню. Вось у чым сутнасьць спраў Інстытуту сацыяльнага перавыхаваньня.

М.

Адроджаная хата-чытальня.

У вёсцы Гатава (Самахвалавіцкі р., Мен. акругі) гады чатыры таму назад была адчынена насткавая хата-чытальня. Шчыры ўдзел у яе арганізацыі прынялі шэфы: на свае ўласныя сродкі абсталявалі хату-чытальню, далі каштоўную бібліятэку, цэлы шэраг плякатаў, газэт.

Спачатку праца пашла добра. Знайшоўся селянін, які ўзяў на сябе абавязкі загадчыка хаты-чытальні, вымясьціў х.-чытальню ў вольным пакоі ў сваёй хаце. Але мінуў год, і праца пачала развальвацца.

Хата-чытальня пашла вандраваць па хатах вёскі і ўрэшце спыніла сваю так добра пачатую культурную справу. Маемасьць пачала нішчыцца, сродкі, якія аднаго разу адпусьцілі грамадзяне нашае вёскі на падняцьцё працы ў хаце-чытальні, безгаспадарча разышліся і ня прынесьлі жаднай карысьці. Урэшце хаце-чытальні пашанцавала: мясцовая школа перайшла ў новы будынак, а хата-чытальня зьмясьцілася ў старым будынку школы.

З гэтага часу зноў распачалася праца. На агульным сходзе вёскі абралі раду хаты-чытальні. Сёе-тое з маемасьці захавалася, засталося каля 400 кніжак з бібліятэкі.

Арганізавалі гурткі: палітыка-асьветны, сельска-гаспадарчы і драматычны. Кіраўніцтва гурткамі ўзяло на сябе мясцовае настаўніцтва, вызначылі бібліятэкара. На драмгурток усклалі абавязак набыць сродкі на палепшаньне абсталяваньня хаты-чытальні.

Зараз наша хата-чытальня мае эстраду, набыла дзесяць новых лавак, закупіла лямпы, газу, шмат плякатаў і газэт.

Наша хата-чытальня ў сучасны момант зьяўляецца сапраўдным культурным асяродзьдзем вёскі. У гэтым годзе ў ёй адбыўся цэлы шэраг гутарак у сувязі з пасяўной кампаніяй і ўзьнялі-цем сельскай гаспадаркі, на антырэлігійныя і палітычныя тэмы. Тут-жа распачалі працу ячэйкі ТДА-Авіахіму, МОПР'у і саюзу бязбожнікаў. Пры хаце-чытальні створана штомесячная насьценная газэта «Прамень».

П. Ш.

ЗЬНІШЧЫМ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ!

У Чырвоную армію пойдзем пісьменнымі.

(Вёска Шышава, Горацкага р., Арш. акр.).

У 1927-28 навучальным годзе райсавет «Прэч Нэпісьменнасьць» і палітчасьць Н-га палка паставілі сабе мэтай зьлікідаваць нэпісьменнасьць сярод дапрызыўнікаў 1907 году. Ды і самі дапрызыўнікі вёскі Шышава пачалі хадайнічаць перад вайсковай палітчасьцю і райённым саветам «Прэч Нэпісьменнасьць» аб адчыненьні для іх лікпункту.

На час лятэрнага збору нераменьнікаў (5 сьнежня 1928 году)) у вёсцы Шышава адчыніўся лікпункт. На лікпункт запісалася 27 чал. Працу вёў у вясковай школе настаўнік шышаўскай школы. Лікпункт працаваў 4 разы ў тыдзень.

Сродкі на выдаткі для шышаўскага лікпункту адпушчаў Горацкі райсавет «Прэч Нэпісьменнасьць» — на газу, сшыткі і іншыя пісьмовыя прылады, а настаўнік працаваў у парадку грамадзкай нагрузкі.

У канцы лятэрнага збору адбыўся выпуск навучаных на лікпункце нераменьнікаў. Скончыла 21 чал.: 7 беднякоў, 5 батракоў і 9 сераднякоў.

Такім чынам, наша моладзь пойдзе ў Чырвоную армію пісьменнай.

Т. С—іч.

За далейшую вучобу.

(Вёска Баршчоўка, Гом. акругі і раёну).

Навучальны год для дарослых вучняў скончыўся. 5 красавіка ў нашым лікпункце ў прысутнасьці адпаведнай камісіі праведзены вучотна-заключныя заняткі, а 7 красавіка адбылася ўрачыстая частка выпуску.

25 чалавек (5 мужчын і 20 жанчын) ліквідавалі сваю нэпісьменнасьць. Па ўзросту—гэта моладзь да 19 год.

Трэба адзначыць, што жаданьне прадягваць адукацыю падкрэсьліў увесь склад даведнікаў лікпункту яшчэ 7 студзеня, калі ў нікая новаму сельсавету быў унесен пункт—адчыніць у Баршчоўцы з новага навучальнага году школу малапісьменных. Пры запаўненьні апытальных лістоў у часе заключных заняткаў, вучні лікпункту зноў выказалі сваё імкненьне працягваць вучобу, таму ўзьнята пытаньне перад Райвыканкомам аб адчыненьні дзеля дарослых вячэрняй школы.

Практыка паказвае, што наша вясковая моладзь шукае веды, што яна цікавіцца вучэньнем. У мінулым годзе скончыла лікпункт 30 чалавек, з якіх значная частка працавала сёлета ў гуртку малапісьменных, які часова існаваў пры хаце-чытальні.

Сталае даведваньне заняткаў на лікпункце сьведчыць, што хатнія і гаспадарчыя справы вучобе не перашкаджаюць, толькі трэба належным чынам асьветнікам і наогул вясковаму актыву ўзяцца за працу.

Маем надзею, што водпуск сродкаў на ліквідацыю малапісьменнасьці будзе павялічан, тады сталая вячэрняя школа і ў нас адчыніць шырока свае дзьверы для тых, хто хоча ўзброіць сябе ведамі.

Мікола Альбіцкі.

Наша праца.

(Магілеўскі Белпэдтэхнікум).

Магілеўскі пэдтэхнікум абласта зьвярнуў вялікую ўвагу на працу па ліквідацыі нэпісьменнасьці. Пэдагагічная рада тэхнікуму вылучыла са свайго складу дзеля кіраваньня гэтай працай двух настаўнікаў-мэтадыстаў.

Пэдагагічная рада дапамагала ў гэтай справе і матар'яльна. Напрыклад, лікпункт у падшэфнай вёсцы (на 37 асоб) утрымліваўся на сродкі пэдтэхнікуму, у самым-жа будынку пэдтэхнікуму займаліся тры лікпункты.

Закладзена 12 лікпунктаў з 472 нэпісьменнымі. На гэтых лікпунктах працуе 19 вылучаных студэнтаў. Рэшта студэнтаў працуе на ліквідацыі нэпісьменнасьці ў індывідуальным парадку.

Пэдтэхнікумаўская ячэйка „ПН" правяла значную працу па перапісу нэпісьменных гораду Магілева.

Блага толькі тое, што часта адбываліся зьмены ліквідатараў на лікпунктах, што значна адбівалася на працы лікпунктаў.

Тодар Мельнікаў.

Тэзісы да антывялікоднай кампаніі.

...а апошні час назіраецца ...ваторае ...ніцьцё рэлігійнай антыпрасьці сярод ...ства і дробна-буржуазных элементаў ...ваду, а таксама ўзмацненьне дзейнасьці ...ставецтва, сэктантаў і г. д. пры выяўленьні ...ёй тактыкі, што выяўляецца ў імкненьні ...ісьнуць пярэд веруючых ва ўсе качэлкі ...ецкага будаўніцтва.

...так, напрыклад, у Смаленскае рэлігій-...я арганізацыі аб'яднаныя сілами агітацыі сярод веруючых за ўдзел у перавыхаваньні ...ецтаў, каб моць нагумысьць пра-...ькі ў саветы «богобоявшемых людей», ...ратоў по вере", і праваліць «бязбожні-...», г. зн. камуністаў і сумленных бес-...ыпяных сялян і батракоў. Тое-ж было ...і іншых мясцовасьцях СССР.

...У нас, у БССР, на Мазырыцкае зьяві-...ся рэлігійная секта чырвоных драконаў, ...на абвясьціла байкот савецкай уладзе і ...м савецкім грамадзянам. Царкоўныя і ...ванскія арганізацыі ўзмоцнена займаюц-...ь шпіёнажам. Такая шпіёнская сэктанц-...я арганізацыя была выкрыта ў Менску. ...ксама на Украіне была выкрыта сярод ...тыскадзіх вобчыны вялікая шпіёнская ар-...нізацыя, на чале якой стаяў вайны Шэў-...к, арганізатар бантыскіх абшчын на ...ыні, увесь час зьвязаны з польскім ге-...ральным штабам. Розными спосабамі ду-...ьвенства старацца захапіць над свой ...ыў дзяцей рабочых, жанчын. Так, у ...ску ксяндзы пачалі цэлую кампанію ...сярод веруючых супроць піянэраў. Для ...ёй рэлігійнай агітацыі царкоўнікі выка-...стоўваюць і нашы цяжкасьці.

...Гэта антыўпасьць, глыбока варожая ўся-...ім нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву і ...згортаньню культурнай рэвалюцыі, зьяў-...ецца адпакай: а) узмацненьня клясавай ...раньбы ўнутры СССР, наступленьня кля-...са варожых элементаў супроць праны, ...ую водзе, над кіраўніцтвам камуністычнай ...ртыі, рабочая кляса СССР; в) адпакай кан-...ідаты ў капіталістычных краінах усіх ...акцыйных і фашысцкіх сіл супроць пра-...марыяту і пралетарскай рэвалюцыі, адбы-...чыцца фактычна пад абзнакам рэлігіі ...прыватнасьці хрысьціянства) і фашы-...

(Напр., дагэтаго памяк Мусаліні і на-...наю, утварэньне асобнай дзяржавы Ватыкану; дыктатура капіталу і пакаяньне рэакцыі пад агідаю рэлігійнасьці і хрысьціянства—Польшча, Літва, Венгрыя і г. г.).

Дзейнасьць духавенства, сэктантаў, рэлігійных і царкоўных арганізацый і таварыстваў асабліва ўзмацняецца ў час такіх рэлігійных сьвят, як так званыя вялікдзень і каляды. Да сьвяткаваньня гэтых сьвят царкоўнікамі выдаюцца асобныя інструкцыі і цыркуляры, з указаньнем, як трэба весьці барацьбу з бязбожжам, якія лёзунгі высоўваць перад веруючымі і г. д. Так, напрыклад, бантысты выдалі асобны цыркуляр да ўсіх веруючых, дзе пішацца: «Мы жывём з вамі ў цяжкія дні, на вучэньне эвангельля—у лукавыя дні, калі ўсе абрушыліся на царкву хрыстову, калі сатана адкрыў вялічайшае ганеніе на дзяцей божых; мы, прапаведнікі эвангельля ў СССР, знаходзімся ў вогненным кругу антыхрыстава акружэньня» і г. д. Для веруючых, такім чынам, улада рабочых і сялян зьяўляецца сілай пекла, сатаны.

У буржуазных краінах сьвята «вялікдзень» адкрыта зьвяжецца з палітычнымі лёзунгамі, накіраванымі супроць пралетарыяту, рэвалюцыі, супроць СССР.

Так, напрыклад, Польшча сьвяткавала апошні «вялікдзень» пад лёзунгам—Хрыстос і Пілсудзкі. Вось вытрымкі з польскіх газэт.

Манархічная газэта «Слово» (орган абшарнікаў) пад малюнкам Хрыста піша: «Уваскрасеньне Хрыста ёсьць рэальны і жывы факт... Ня толькі адзінкі, але і цэлыя дзяржавы лічацца з фактам уваскрасеньня Хрыста, як з фактам рэальным, і свае паводзіны прыстасоўваюць да вышэйшай, якія выходзяць з гэтых фактаў... бог клапоціцца аб Польшчы. Яму Польшча абавязана і мужчынам польскага жаўнежа і генэрам прамадзыра Пілсудзкага. З ласкі божай у 1919 годзе на вялікдзень Польшча адабрала ад бальшавікоў Вільню». І далей... „уваскрасеньне Хрыста на толькі пацьвяржае веру нашу, але зьяўляецца сродкам нашай надзеі на канчаткоўны трыумф праўды над фальшу, на трыумф пакаятнай праўды і ашлёванай справядлівасьці (абшарніцкай, бязумоўна). Мы на ведаем тэрміналу бойкі—яны знаходзяцца ў руках бога. Польшча невінна ісьці на шляху, паказанаму богам, бо гэта ёсьць шлях пэрамог... Нам ня страшны навалініцы і буры, мы будзем маліцца но аб міры і спакоі, а аб моцным руху ў часе навалініцы».

Орган пілсудчыкаў «Глос Правды» таксама пад малюнкам Хрыста піша, што Польшчу ўваскрасіў дух...Пілсудзкага, і што кожны полк, калі ён хоча паўстаць у духу з мёртвых, павінен згуртавацца навакол Пілсудзкага.

Усякія рэлігіі заўсёды былі на старане пануючай клясы эксплёататараў. У 1905 г. царква і рэлігія выступаюць супроць першай рэвалюцыі за самаўладзтва, арганізуе пагромы, вядзе антысэміцкую агітацыю. У 1906-1909 г. рэлігія і царква ідуць на чале рэакцыі разам з жандармамі, катамі, охранкай і паліцыяй. Хрыстос—правадыр чорнай сотні—гэта ніч таго часу царкоўнікаў расейскіх. А зараз тыя ж царкоўнікі і сэктанты, прыкрываючыся маскай савецкай лёяльнасьці, кажучы, што Хрыстос—першы камуніст. У часе імпэрыялістычнай бойкі з імем Хрыста і крыжам царкоўнікі, сэктанты і г. д. гналі шырокія масы чалавецтва на імпэрыялістычную бойню, абяцаючы ім за гэта рай пасьля сьмерці. У часе грамадзянскай вайны пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі супроць першай савецкай рэспублікі выступіў аб'яднаны чорны інтэрнацыянал усіх рэлігій, царквоў, папоў усіх стран і масьцей, капіталістаў, абшарнікаў і генэралаў. Гарматамі і кулямётамі, шыбеніцамі і расстрэламі, богам і крыжам—гэты чорны інтэрнацыянал рэакцыі прабаваў задавіць рабочую клясу і зноў дзевіць пазнаваньне буржуазеі. І дасьдзя перамогі ў грамадзянскай вайне пралетарыяту гэты вечны саюз рэлігій, царквоў, цэмры і капіталу ня спыніўся, а яшчэ больш узмацніўся для далейшай барацьбы з пралетарыятам і пралетарскай рэвалюцыяй. Толькі ў апошні год у капіталістычных краінах было забіта за ўдзел у рэвалюцыйным руху 146000 чал., арыштавана і пасаджана ў турмы 15000 чал., за адзін толькі апошні год французская буржуазея ў Афрыканскіх калёніях зьнішчыла 17000 пэтраў. Агенты ангольскай буржуазеі арганізавалі рэакцыйнае паўстаньне ў Афганістане, выкарыстаўшы цёмныя рэлігійныя масы. Прыкрываючыся рэлігійнасьцю, крыстом-богам, хаусьлівымі размовамі аб згодзе, капіталістычныя краіны рыхтуюцца да новай сусьветнай бойні. У выпадку вайны супроць СССР на баку буржуазеі і капіталу будуць усе рэлігіі і царквы, папа і папы і ўсе іх прыхвасьні. Нахай кожны сьвядомы і сумленны савецкі грамадзянін зробіць адсюль належныя вывады. Рашучая барацьба з рэлігіяй—аплотам цэмры, рэакцыі і прыгнечаньня.

У аснове сьвяткаваньня вялікадню сярод яўрэяў ляжыць апавяданьне аб прабываньні яўрэяў у Эгіпце і выхадзе адтуль. Але гэта апавяданьне найбольш аўтарытатнымі вучонымі лічыцца непраўдападобным. У аснове сьвяткаваньня «вялікдня» сярод веруючых у Хрыста пакладзены апавяданьні аб сьмерці і ўваскрасеньні Хрыста, сына божага, які нібы-та зышоў з неба, каб збавіць чалавецтва ад першароднага граху, пракляцьця і сьмерці. Сучасная гістарычная навука пасьля падрабязнага і крытычнага вывучэньня ўсіх матар'ялаў прыходзіць да вынікаў, што Хрыста, як гістарычнай асобы, ніколі ня было. Гісторыя чалавецтва нічога ня ведае пра Хрыста, а пагатаму Хрыстом немагчыма і апраўдаць, як рэальнай рэчай, на ім цельга што небудзь будаваць.

У гэтых эвангельях даюцца бытаньня рэчы і апавяданьні, дзе ўвасабляюцца надзеі і легенды яўрэяў далёкай ад нас эпохі. Апавяданьне аб уваскрасеньні Хрыста зьяўляецца пераказам яшчэ больш старажытных легенд і казак аб багах, якія сходзяць з неба, жывуць сярод людзей, паміраюць, а потым зноў ажываюць. «Вялікдзень» сьвяткавалі яшчэ задоўга да нараджэньня хрысьціянскай рэлігіі старажытныя паганскія (язычэскія) рэлігіі, усходніх народаў, займаўшыхся землеробствам. Для іх „вялікдзень" быў сьвятам вясны, вясенняга ажываньня прыроды. Так, у Эгіпце за 1000 год да нараджэньня хрысьціянскай рэлігіі сьвяткавалі ўваскрасеньне бога Азірыса.

Пад відам пахаваньня і ўваскрасеньня бога Азірыса старажытныя э

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

ПАСТАНОВА
Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР
аб працоўнай дарожнай павіннасьці.

Сучасны стан мясцовых дарог БССР стварае значныя перашкоды для нармальнага эканамічнага разьвіцьця краіны. Перавозка да месц збыту сельска-гаспадарчых прадуктаў і падвоз сялянству прадуктаў прамысловасьці па незладжаных дарогах абходзіцца вельмі дорага і праз гэта ў значнай меры даражэюць і тавары. Дрэнны стан дарог таксама значна перашкаджае сувязі сельскіх мясцовасьцяй з культурнымі цэнтрамі нашае краіны.

Урад робіць усе захады для ўпарадкаваньня дарог Рэспублікі і выдзяляе на гэта значныя сродкі. Аднак, дарожная справа патрабуе для свайго ўпарадкаваньня шмат больш сіл і сродкаў, чымся дзяржава ў сучасны момант можа выдзяліць на гэтую справу. Інтарэсы-ж народнай гаспадаркі не дазваляюць расьцягваць наладжаньне дарог на доўгі шэраг гадоў. Усё працоўнае насельніцтва краіны зацікаўлена ў найбольш хуткім зьнішчэньні ўсіх перашкод, якія вынікаюць для народнае гаспадаркі з дрэннага стану дарог. У зьвязку з гэтым, для найбольш хуткага вырашэньня гэтага важнага для ўсяе народнае гаспадаркі і працоўнага насельніцтва пытаньня, ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць устанавіць наступны парадак удзелу насельніцтва ў пабудове і паленшаньні усіх дарог раённага і сельскага значэньня, а таксама той часткі дарог акруговага значэньня, якія праходзяць на тэрыторыі зямель насельнага пункту:

1. Мясцовае насельніцтва, савецкія гаспадаркі, калектыўныя гаспадаркі (камуны, сельска-гаспадарчыя арцелі і інш.), прыватныя прамысловыя і іншыя прадпрыёмствы, якія карыстаюцца мясцовымі дарогамі, паводле пастаноў раённых выканаўчых камітэтаў, прыцягваюцца да бясплатнае дарожнае павіннасьці. Гэтыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў ажыцьцяўляюцца толькі пасьля зацьверджаньня іх акруговым выканаўчым камітэтам.

2. Прыцягненьне да працоўнае дарожнае павіннасьці дазваляецца толькі тады, калі пляны будаўніцтва і паленшаньня дарог ня могуць быць ажыцьцёўлены за кошт сродкаў, якія ёсьць на гэтую патрэбу ў мясцовага савету альбо выканаўчага камітэту.

3. Да работ, якія выконваюцца ў парадку працоўнай павіннасьці, належаць: паленшаньне палатна дарогі, грабарныя работы, будаваньне грэбляў, мастоў, гаваў, пропуск вады, дробныя цесьлярскія работы, загатоўка, вывазка і дастаўка дрэва, каменьняў і іншых дарожна-будаўнічых матар'ялаў.

4. Насельніцтва, гаспадаркі і прадпрыёмствы (арт. 1 гэтае пастановы) прыцягваюцца да працоўнае дарожнае павіннасьці з рабочаю жывёлаю, апроч заводзкае, і патрэбнымі гужавымі транспортнымі сродкамі і інвэнтаром.

Праца жанчын павінна скарыстоўвацца на менш цяжкіх работах.

5. Да працоўнае дарожнае павіннасьці ня могуць прыцягвацца:

а) асобы, якім няма 18 год;

б) мужчыны ад 45 год і жанчыны ад 40 гадоў;

в) непрацаздольныя асобы;

г) цяжарныя жанчыны на час за 8 тыдняў да родаў і парадзіхі на працягу 8 тыдняў пасьля родаў;

д) жанчыны, што кормяць дзяцей грудзьмі;

е) жанчыны, што маюць дзяцей да 8 гадоў пры адсутнасьці асобы, якая даглядае за імі;

ж) інвалёды працы і вайны;

з) асобы, што знаходзяцца на вайсковай службе ў кадравых частках Чырвонай арміі і флёту, войск ДПУ, пагранічных войск і канвойнае варты, а таксама асобы, што знаходзяцца ў пераменным складзе тэрытарыяльных частак Чырвонай арміі, у часе адбываньня тэрытарыяльных збораў;

і) асобы, што знаходзяцца на службе ў дзяржаўных, грамадзкіх і кааперацыйных установах і прадпрыёмствах

к) рабочыя (сталыя, часовыя і сэзонныя) дзяржаўных, кааперацыйных і прыватных прадпрыёмстваў, а таксама батракі, якія ня маюць уласнай гаспадаркі ў данай мясцовасьці.

У паасобных выпадках, у залежнасьці ад матар'яльнага стану, ад стану здароўя і іншых важных прычын, сельскі савет можа адтэрмінаваць альбо звольніць ад працоўнае дарожнае павіннасьці і інш. асоб, непрадугледжаных гэтым пералікам. Аб такіх выпадках сельскі савет павінен паведаміць раённы выканаўчы камітэт

6. Кожная асоба, на падставе пастановы раённага выканаўчага камітэту, зацьверджанай акруговым выканаўчым камітэтам, прыцягваецца да дарожнае працоўнае павіннасьці ня больш як на шэсьць дзён на працягу году сельскім саветам, які вызначае месца, час і тую работу, якая павінна быць выканана.

Свае загады сельскі савет ажыцьцяўляе праз спэцыяльна вылучаных сельскім саветам дарожных старост для палёку, кіраваньня і нагляду за правядзеньнем работ.

Ня могуць прыцягвацца да працоўнай дарожнай павіннасьці адначасна ўсе члены сям'і.

7. Савецкія гаспадаркі ўдзельнічаюць у працоўнай дарожнай павіннасьці ня больш нормы, устаноўленай для данай мясцовасьці, з разьліку штатнага складу рабочых і служачых данай гаспадаркі на 1-е мая кожнага году.

8. Лік дзён працоўнага ўдзелу для грамадзян, што прыцягваюцца да дарожных работ без рабочае жывёлы і з жывёлаю, а таксама нормы грашовае замены ўстанаўляюцца штогод райённым выканаўчым камітэтам.

Лік дзён працоўнага ўдзелу можа быць устаноўлены ў неадналькавым разьмеры для розных катэгорый насельніцтва (уладароў прадпрыёмстваў, гандляроў, кулакоў, сераднякоў, саматужнікаў, беднаты і інш.) з тым, каб: а) лік дзён у кожным разе не перавышаў ні для воднае з гэтых катэгорый шасьці дзён на год і б) лік дзён для працоўнага ўдзелу в рабочай жывёлай устанаўляўся меншы, чымся бяз жывёлы.

9. Не дазваляецца прыцягваць да дарожнай працоўнай павіннасьці насельніцтва, якое жыве ад месца работы далей за 10 кілёмэтраў.

Матар'ялы могуць падвозіцца на адлегласьці ня больш 25 кілёмэтраў.

10. Раённыя выканаўчыя камітэты павінны ўстанавіць, што на працягу двох месяцаў, калі праводзяцца інтэнсыўныя сельска-гаспадарчыя работы (прыблізна ліпень-жнівень), насельніцтва ня можа прыцягвацца да працоўнае дарожнае павіннасьці.

11. Замест натуральнага выкананьня працоўнае дарожнае павіннасьці, грамадзяне, гаспадаркі і прадпрыёмствы (арт. 1) могуць уносіць належную грашовую суму тым органам, якія прыцягваюць іх да выкананьня павіннасьці.

Заявы аб замене натуральнае павіннасьці грашыма падаюцца мясцоваму савету не пазьней за два тыдні ад дня абвяшчэньня аб прыцягненьні да дарожнае павіннасьці.

12. Адказнасьць за правільнасьць і своячаснасьць арганізацыі дарожных работ, якія праводзяцца ў парадку дарожнае працоўнае павіннасьці, забясьпечаньня работ тэхнічным кіраваньнем, будаўнічымі матар'ялямі, за рацыянальнае скарыстаньне працоўнага ўдзелу насельніцтва ўскладаецца на акруговы і раённыя выканаўчыя камітэты.

13. Страты пры выкананьні працоўнай павіннасьці ад падзежу альбо хваробы жывёлы сплачваюцца ўласьнікам жывёлы натураю альбо грашыма па рынкачаму кошту з сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту.

14. Скаргі на няправільнае правядзеньне мясцовымі саветамі працоўнае дарожнае павіннасьці падаюцца ў раённы выканаўчы камітэт, а на пастанову раённага выканаўчага камітэту—у акруговы выканаўчы камітэт. Пастановы акруговага выканаўчага камітэту зьяўляюцца канчатковымі. Падача скаргі на загады і пастановы мясцовых саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў ня спыняе выкананьня гэтых загадаў і пастаноў.

15. За няўку на адбываньне дарожнае павіннасьці накладаецца ў адміністрацыйным парадку штраф да трох рублёў за кожны дзень нявыхаду на работу і разам з тым, спаганяюцца сумы, устаноўленыя паводле арт. 8 гэтае пастановы ў адміністрацыйным парадку, устаноўленым для спагнаньня падаткаў.

16. Сумы, атрыманыя ад грамадзян замест натуральнага адбываньня дарожнае павіннасьці (арт. 11), а таксама сумы спагнаныя за няўку на работу (арт. 15), скарыстоўваюцца на выкананьне тых работ, якія мелі быць выкананымі ў натуральным парадку.

17. Асобы, вінаватыя ў безгаспадарчым скарыстаньні працоўнага ўдзелу насельніцтва ў дарожных работах, адказваюць у крымінальным парадку.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

19 красавіка 1929 г.,
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ
Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР
о трудовой дорожной повинности.

Теперешнее состояние местных дорог БССР создает значительные препятствия для нормального экономического развития страны. Перевозка к местам сбыта сельскохозяйственных продуктов и подвоз крестьянству продуктов промышленности по неустроенным дорогам обходится очень дорого, благодаря чему в значительной мере дорожают и товары. Плохое состояние дорог также значительно препятствует связи сельских местностей с культурными центрами нашей страны.

Правительство принимает все меры к упорядочению дорог Республики и выделяет на это значительные средства. Однако, дорожное дело требует для своего упорядочения гораздо больше сил и средств, чем государство в настоящий момент может выделить на это дело. Интересы же народного хозяйства не позволяют оттягивать налаживание дорог на много лет. Все трудящиеся население страны заинтересовано в скорейшем устранении всех препятствий для народного хозяйства, возникающих из плохого состояния дорог. В связи с этим, для скорейшего разрешения этого важного для всего народного хозяйства и трудящегося населения вопроса, Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют установить следующий порядок участия населения в устройстве и улучшении всех дорог районного и сельского значения, а также той части дорог окружного значения, какие проходят на территории земель населенного пункта:

1. Местное население, советские и коллективные хозяйства (коммуны, сельскохозяйственные артели и др.), частные промышленные и прочие предприятия, пользующиеся местными дорогами, на основании постановлений районных исполнительных комитетов привлекаются к бесплатной дорожной повинности. Эти постановления районных исполнительных комитетов проводятся в жизнь по утверждению их окружным исполнительным комитетом.

2. Привлечение к трудовой дорожной повинности допускается только тогда, когда планы строительства и улучшения дорог не могут быть осуществлены за счет средств, имеющихся на эту надобность у местного совета или исполнительного комитета.

3. К работам, выполняемым в порядке трудовой повинности, относятся: улучшение полотна дороги, земляные работы, постройка плотин, мостов, гатей, пропуск воды, мелкие плотничьи работы, заготовка, вывозка и доставка лесных, каменных и др. дорожно-строительных материалов.

4. Население, хозяйства и предприятия (ст. 1 настоящего постановления) привлекаются к трудовой дорожной повинности с рабочим скотом, кроме племенного, и необходимыми гужевыми транспортными средствами и инвентарем.

Труд женщин должен использовываться на менее тяжелых работах.

5. К трудовой дорожной повинности не могут привлекаться:

а) лица не достигшие 18 лет;

б) мужчины старше 45 лет и женщины старше 40 лет;

в) беременные женщины на время за 8 недель до родов и роженицы в течение 8 недель после родов;

д) женщины, кормящие грудью детей;

е) женщины, имеющие детей до 8-миленего возраста, при отсутствии лица, ухаживающего за ними;

ж) инвалиды труда и войны;

з) лица, состоящие на военной службе в кадровых частях Красной армии и флота, войск ГПУ, пограничных войск и конвойной стражи, а также лица, состоящие в переменном составе территориальных частей Красной армии во время отбывания территориальных сборов;

и) лица, состоящие на службе в государственных, общественных и кооперативных учреждениях и предприятиях;

к) рабочие (постоянные, временные и сезонные) государственных, кооперативных и частных предприятий, а также батраки, не имеющие собственного хозяйства в данной местности.

В отдельных случаях, в зависимости от материального положения, от состояния здоровья и др. уважительных причин, сельский совет может отсрочить или освободить от трудовой дорожной повинности и других лиц, не предусмотренных настоящим перечнем. О таких случаях сельский совет должен сообщить районному исполнительному комитету.

6. Каждое лицо, по постановлению районного исполнительного комитета, утвержденному окружным исполнительным комитетом, привлекается к трудовой дорожной повинности не более, чем на шесть дней в течение года сельским советом, который определяет место, время и ту работу, которая должна быть выполнена.

Свои распоряжения сельский совет проводит через специально выделенных сельским советом дорожных старост для учета, руководства и наблюдения за проведением работ.

Не могут привлекаться к трудовой дорожной повинности одновременно все члены семьи.

7. Советские хозяйства принимают участие в трудовой дорожной повинности не свыше нормы, установленной для данной местности, из расчета штатного состава рабочих и служащих данного хозяйства на 1 мая каждого года.

8. Число дней трудового участия для граждан, привлекаемых к дорожным работам без рабочего скота и со скотом, а также нормы денежной замены устанавливаются ежегодно районным исполнительным комитетом.

Число дней трудового участия может быть установлено в неодинаковом размере для разных категорий населения (владельцев предприятий, торговцев, кулаков, середняков, кустарей, бедноты и пр.) с тем, чтобы: а) число дней во всяком случае не превышало ни для одной из этих категорий шести дней в год и б) число дней для трудового участия с рабочим скотом устанавливалось меньше, чем без скота.

9. Не допускается привлекать к дорожной трудовой повинности население, проживающее от места работы дальше 10 километров.

Материалы могут подвозиться на расстояния не свыше 25 километров.

10. Районные исполнительные комитеты должны установить, что в течение двух месяцев, когда проводятся интенсивные сельско-хозяйственные работы (примерно июль—август), население не может привлекаться к трудовой дорожной повинности.

11. Вместо натурального выполнения трудовой дорожной повинности граждане, хозяйства и предприятия (ст. 1) могут вносить соответствующую денежную сумму органам, привлекающим их к выполнению повинности.

Заявления о замене натуральной повинности деньгами подаются местному совету не позже двух недель со дня об'явления о привлечении к дорожной повинности.

12. Ответственность за правильность и своевременность организации дорожных работ, проводимых в порядке трудовой дорожной повинности, обеспечение работ техническим руководством, строительными материалами и за рациональное использование трудового участия населения возлагается на окружные и районные исполнительные комитеты.

13. Убытки при выполнении трудовой повинности от падежа или болезни скота оплачиваются владельцам скота натурою или деньгами по рыночной стоимости из средств соответствующего местного бюджета.

14. Жалобы на неправильное проведение местными советами трудовой дорожной повинности подаются в районный исполнительный комитет, а на постановления районного исполнительного комитета в окружной исполнительный комитет. Постановления окружного исполнительного комитета являются окончательными. Подача жалобы на распоряжения и постановления местных советов и районных исполнительных комитетов не приостанавливает исполнения этих распоряжений и постановлений.

15. За неявку на отбывание дорожной повинности налагается в административном порядке штраф до трех рублей за каждый день невыхода на работу и, кроме того, взыскиваются суммы, определенные на основании ст. 8 настоящего постановления в административном порядке, установленном для взыскания налогов.

16. Суммы, поступившие от граждан вместо натурального отбывания дорожной повинности (ст. 11), а также суммы, взысканные за неявку на работу (ст. 15), используются на выполнение тех работ, которые должны были быть выполнены в натуральном порядке.

17. Лица, виновные в безхозяйственном использовании трудового участия населения в дорожных работах, несут ответственность в уголовном порядке.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

19 апреля 1929 г.
г. Минск.

ХРОНІКА.

Ад'езд т. Чарвякова ў Маскву.

У суботу, 20 красавіка, старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў выехаў па службовых справах у Маскву.

Падрыхтоўка да першамайскіх сьвят.

Пачынаючы з 22 красавіка па ўсіх клюбах, чырвоных кутках, школах і курсах прафграматы будуць праводзіцца гутарні аб значэньні першамайскага сьвята.

Клюбы, чырвоныя кутні і сады будуць прыстасаваны для наступнай працы з тым, каб сваімі вечарамі і іншымі мерапрыёмствамі заняць рабочых і служачых з іх сем'ямі ў працягу першамайскіх дзён, а таксама і ў «вялікодныя» дні.

У падрыхтоўку і правядзеньне сьвята будзе ўцягнуты ўвесь прафэсыйны і культурны актыў, дэлегаткі і жоны рабочых.

Дадзена ўказаньне падрыхтаваць саюзныя аркестры, струнныя і музыкальныя гуртні гарманістаў, цымбалістаў для арганізаванага ўдзелу ў дэманстрацыі.

Гуртні фізкультуры, бібліятэкі і наогул усе клюбныя гуртні вядуць узмоцненую падрыхтоўку да правядзеньня першамайскага сьвята.

Для рабочых-яўрэяў у клюбах і чырвоных кутках у дні 24 і 25 красавіка будуць наладжаны антырэлігійныя вечары з мастацкімі пастаноўкамі.

30 красавіка і 1 і 2 мая па ўсіх клюбах і чырвоных кутках, а ў выпадку цёплага і яснага надвор'я і па ўсіх садох, арганізуюцца мастацкія вечары з адпаведнымі дакладамі. 1 мая ўсе рабочыя і служачыя з сем'ямі прымуць удзел у першамайскай дэманстрацыі. У гэты дзень па ўсіх тэатрах і кіно будуць наладжаны бясплатныя пастаноўкі і сэансы, якія ў першую чаргу абслужаць Чырвоную армію і беспрацоўных біржы працы.

Масавыя вечары будуць таксама наладжаны 4, 5 і 6 мая з мастацкімі пастаноўкамі і выступленьнямі клюбных гурткоў.

2 мая, а таксама і ў іншыя дні мясцовымі саюзнымі арганізацыямі будуць наладжвацца экскурсіі і прагулкі за горад.

Культаддзел ЦСПСБ даў указаньне, каб на ўсіх мерапрыёмствах клюбаў і садоў быў забясьпечан удзел падшэфных вайсковых часьцей, а ў адзін з гэтых дзён будуць наладжвацца наведваньні чырвоных казарм групамі рабочых і іх сем'ямі.

Шэфскія выезды ў вёсны прыстасоўваюцца да 4-5 мая.

Тлумачэньне НК Працы аб працы ў майскія і вялікодныя дні

З прычыны запытаньняў ад розных калектываў рабочых і служачых аб магчымасьці замены дзён аўрэйскага і праваслаўнага «вялікадня» іншымі днямі, Народны Камісарыят Працы БССР, па ўзгадненьні з ЦСПСБ, паведамляе, што дні 1 і 2 мая зьяўляюцца сьвяточнымі днямі, а 3 і 4 мая—рабочымі днямі.

Дзень 5 мая зьяўляецца выхадным днём для тых, для якіх нядзеля наогул зьяўляецца выхадным днём.

Што датычыцца дзён 25 красавіка (першы дзень аўрэйскага «вялікадня») і 6 мая (другі дзень праваслаўнага «вялікадня»), дык гэтыя дні, на аснове пастаноў агульных сходаў рабочых і служачых, могуць быць рабочымі днямі з заменай іх 11 ліпеня—дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Рабочыя прамысловых прадпрыёмстваў могуць таксама працаваць у выхадны дзень 5 мая, замест якога адзін дзень адпачынку можа далучацца да бліжэйшага пасьля першамайскіх сьвят рэвалюцыйнага сьвята, калі аб гэтым будуць пастановы агульных сходаў рабочых.

ПАВОДКА Ў МЕНСКУ.

Самы высокі ўзровень вады на р. Сьвіслач, у параўнаньні са звычайным, дасягаў 2,5 мэтраў. Уноч з суботы на нядзелю вада ў рацэ пачала паступова зьніжацца і да паўдня ўчарайшага дню яна зьнізілася болш, чым на мэтр.

Тройка па барацьбе з паводкай перасяліла шмат сем'яў з затопленых дамоў Пуліхаўскай слабады, Мала-Татарскай, Садова-Набережнай і іншых вуліц. Вадой быў заліты завод „Камунар“ і майстэрня працкалектыву абутнікаў.

Вада ў Сьвіслачы паступова ўбывае.

Рабочая моладзь дапаможа ачысьціць саванарат.

21 красавіка ў памяшканьні клюбу КІМ адбыўся гарадзкі зьлёт „лёгкіх кавалерыстаў“, на якім прысутнічала да 200 чалавек моладзі.

З дакладам аб чыстцы савецкага апарату і задачах «лёгкіх кавалерыстаў» выступіў прадстаўнік РСІ т. Жукаў, які абмалёўваў задачы чысткі апарату наогул, і задачы моладзі, у прыватнасьці „лёгкай кавалерыі“ у гэтай справе.

Выступаўшыя ў спрэчках зазначалі на неабходнасьць правядзеньня жорсткай чыстки. Некаторыя з таварышоў указвалі, што трэба сачыць за тым, каб у шэрагі «лёгкай кавалерыі» не пралезлі непатрэбныя нам элементы. Наогул, агульная думка «лёгкіх кавалерыстаў», што чыстка савецкага апарату насьпела, і што рабочая моладзь акажа рабоча-сялянскай інспэкцыі дапамогу ў гэтым пытаньні.

15 мая адчыняецца сэзон у летніх дамох адпачынку.

Летнія дамы адпачынку пачнуць функцыянаваць з 15 мая. Дом адпачынку ў Ждановічах за летні перыяд прапусьціць да 3500 чалавек. Месны, якія ня былі скарыстаны у гэтым доме ўзімку, будуць выкарыстаны ў летні час.

Новы дом адпачынку.

Менская акруговая страхкаса ў памяшканьні Стара-Барысаўскага сельска-гаспадарчага тэхнікуму арганізуе на летні час агульна-саюзны дом адпачынку. Гэты дом адпачынку, разлічаны на 100 чалавек, будзе адчынен з 1 чэрвеня. За летні сэзон праз дом адпачынку будзе прапушчана да 600 чалавек.

300000 руб. на скончэньне пабудовы санаторыя для хворых на сухоты.

На скончэньне пабудовы санаторыя для сухотных хворых імя 10-годзьдзя існаваньня БССР Галоусацстрах сёлета адпускае 30000 руб. Будаўнічыя работы па санаторыю вядзе Белжылсаюз, які для кіраўніцтва імі выпісаў спэцыяліста з Ленінграду.

БІБЛІАГРАФІЯ.

М. А. ЦЯРОХІН. Пладовыя гадавальнікі. Пераклад з расейскага. Беларусдзяржвыдавецтва. Менск. Стар. 80. Цана 20 кап. Тыраж 7000.

Лічыць адна карысная і вельмі патрэбная для нашага сельскага гаспадара кніжка, выпушчана Беларусдзяржвыдавецтвам у Яна носіць назву: «Пладовыя гадавальнікі».

Сяляне ўжо добра ведаюць, што даюць карысьць. Адзін гектар сада даць столькі карысьці, колькі ня другому гаспадару і дзесяць гектар поўкі.

І вось сяляне пачалі садзіць сады, жаль трудна знайсьці сажанцаў.

За часы царскай і грамадзянскай пладовыя гадавальнікі амаль зусім ні. Савецкая ўлада зьвярнула на гэта лівую ўвагу. Шмат дзе зямельныя ніцты, камэрцыйныя аб'яднаньні, і сельска-гаспадарчыя школы пачалі даць садовыя гадавальнікі. Аднак, чых гадавальнікаў мала, каб задаволіць пыт на сажанцы. Вось чаму трэба сялянам закладаць садовыя гадавальні.

Кніжка «Пладовыя гадавальнікі» сваёю мэтаю дакладна расказаць аб тым, што трэба ведаць селяніну аб гадаваньні пладовых дрэў.

У кніжцы разгледжаны наступныя тэмы: насьнёвы для гадаваньня дзічкі, якіх пладовых дрэў зьбіраць насьнёвы, гадаваньня дзічак яблыні, ігрушы, сьлівы; выбар зямлі і ўрабленьне пад засеў дзічак; захаваньне насьнёвы; сяўба і даглядзе за сяўбой; гадаваньне маладых сажанцаў; дагляды імі і г. д.

У кніжцы прадугледжаны ўсе дробязі даўлі пладовых сажанцаў і кожны мала граматны гаспадар можа зусім разабрацца ва ўсім, што напісана ў ёй, бо кніжка напісана вельмі папулярна, вай. У кнізе шмат малюнкаў.

Кніжку трэба раіць усім нашым сяльскім гаспадарам, а асабліва-ж нашым сяльскім пачатковым школам, дзе ёсьць пасьлядзіцелі зямлі.

Гэта дало-б і дзецям патрэбныя веды садоўніцтве і нашаму сялянству патрэбную сажанцы.

П.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня 23 красавіка а 7 гадз. вечара адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы.

Парадак дня: даклад выканбюро таварыства саюзу працасьветы аб працы.

Запрашаюцца асьветнікі гор. Менска.

Адказны рэдактар
М. КУДЗЕЛЬНІК

Абавязковая пастанова № 22
МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТУ Р., С. І Ч. ДЭПУТАТАЎ

Гор. Менск. 17 красавіка 1929 г.

Аб прадстаўленьні зьвестак на хворых сухотамі.

Для прыняцьця прафілактычных мер адносна хворых сухотаю ў адкрытай форме Менскі Гарадскі Савет Рабочых Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў пастанаўляе:

1. Абавязаць усіх уласьнікаў прыватных лячэбніц і вольна-практыкуючых дактароў у г. Менску паведамляць Менскі Цэнтральны Туберкулёзны Інстытут па формах №№ 1 і 2, устаноўленых Інспэкцыяю Аховы Здароўя: а) аб усіх выпадках адкрытай формы сухот лёгкіх не пазьней 72 гадзін пасьля ўстанаўленьня дыягназу і б) аб усіх выпадках сьмерці ад сухот у адкрытай форме не пазьней 24 гадзін пасьля канстатаваньня сьмерці.

Увага. Паведамленьні аб сьмерці ў Туб. Інстытут не звальняюць дактароў і ўстановы ад выдач доктарскіх пасьведчаньняў аб сьмерці для прадстаўленьня органам ЗАГС'у.

2. Асобы і ўстановы, прадугледжаныя п. 1-м гэтай абавязковай пастановы, несваячасова паведаміўшыя, альбо зусім не паведаміўшыя аб выпадках, знайдзеных сухотных хворых у адкрытай форме і сьмерці ад яе, падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку: штрафу да 50 руб., ці прымусовых работах да 14 дзён.

3. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на сан-нагляд і Туб. Інстытут.

4. Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу праз 7 дзён з дня апублікаваньня яе.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету АКСЮЧЫЦ.

Сэкратар Менскага Гарадзкога Савету ПАСЫНКОЎСКІ.

НОВЫЯ КНІГІ.
БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

Бібліятэка школьніка

КОНАН-ДОЙЛЬ
ГЛЫБІНЯ МАРАКОТА
Стар. 122 Цана 45 к.

Зборнік нязвычайных апавяданьняў
Між жыцьцём і сьмерцю
Стар. 61. Цана 45 к.

П. ІЛЬЛЮЧОНАК
ЖЫЦЬЦЁ ЖЫВЁЛ МАЛПЫ
Стар. 153. Цана 1 р. 10 к.

Н. ЧУКОЎСКІ
МЫЙ ДА ДЗІРАК
КІНЕМАТОГРАФ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ
—) З МАЛЮНКАМІ (—
Стар. 24. Цана 1 р. 10 к.

В. СТРАКОЎСКІ
ЧАРГОВЫЯ ПЫТАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА
Стар. 59 Цана 40 к.

М. ХВЕДАРОВІЧ
НАСТРОІ
ВЕРШЫ
Стар. 117 Цана 90 к.

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
АЎТОРАК, 23 КРАСАВІКА
на карысьць аздаравіцельнай кампаніі моладзі
КАР'ЕРА „ТАВАРЫША“ БРЫЗГАЛІНА
Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». 3 аўторка, 23 красавіка. МАСТАЦКІ БАЯВІК „ДЖЫМІ ХІГІНС“ ПА РАМАНУ Э. СІНКЛЕРА.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». МАСТАЦКІ БАЯВІК „МОТЭЛЭ ШПІНДЛЕР“ ДРАМА Ў 6 ЧАСТКАХ.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. З АЎТОРКА 23 КРАСАВІКА „ГЕРОІ КАНЦАВОСЬСЯ“ ПАЧАТАК СЭАНСАЎ А 6 З ПАЛ. ГАДЗ.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». „Стэнлей у нетрах Афрыкі“. 2-я сэрыя.

Да ведама ўсіх перакладчыкаў і стыльрэдактароў
—) ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ ДЛЯ БДВ. (—
Белдзяржвыдавецтва запрашае ўсіх на нараду, якая адбудзецца ў аўторак 23-IV—29 г. у памяшканьні БДВ, Савецкая, 63, 2-гі паверх, а 7 гадз. увечары.
ПАРАДАК ДНЮ:
1. Інфармацыя т. ЦЬВІКЕВІЧА пра пастаноўку справы перакладаў і стыльрэдакцыі ў БДВ.
2. Выбары прадстаўніка ад перакладчыкаў у канфліктную камісію.

БЕЛБЮРО ІНСТЫТУТУ ДЗЯРЖАЎНЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ-ЭКСПЭРТАЎ паведамляе аб зацьверджаньні ў члены ІДБЭ наступных асоб:
1. КУЛЬЧЫЦКАГА Ўладзіміра Паўлава.
2. ЗЬВЯНІГАРОДЗКАГА Хведара Міхасёва.
У КАНДЫДАТЫ:
1. ГІРШОНА Майсея Язэпава.
БЕЛБЮРО ІДБЭ.

ЗГУБЛЕНЫ:

Кааперац. кніжка № 155 Лемеша А. І., выд. праўл. каапер. „Земляроб“, кв. 634.
Пасьведчаньне Бак І. І. на атрыманьне кніжкі на хлеб, выд. 4-м аддз. міліц. г. Менску, кв. 635.
Біржавы талён Тэйф Е. С., выд. менбіржай працы, кв. 636.
Біржавы талён Розум З. І., выд. менбіржай працы, кв. 637.
Пашпарт Клюгэра М. Э., выд. упаўн. нарком. замежных спраў пры ўраде БССР, кв. 638.
Асабовая кніжка Бортнік М. М., выд. Самахвалав. РВК, кв. 639.
Біржавы талён Рузава А. С., выд. Менбіржай Працы, кв. 640.
Сяброўскі білет Куртэ Я. П., выд. ЦП Саюза мэдсанпрацы, кв. 641.
Беспрацоўная кніжка за № 21979 Паныш. П. Т., выд. Менакрэстрахкасай, кв. 642.
Ліст на атрыманьне дапамогі Севіча М. В., выд. Менск саюз забясп. кв. 643.
Біржавы талён Левіна А. М., выд. Менбіржай Працы, кв. 644.
Вучнёўск. пасьведчаньне за № 31 Пяцюка К., выд. практыказальнай паказальнай школай пры Белнадтэхнікуме, кв. 645.
Пашпарт Гінбурга Е. К., выд. менакрміліц., кв. 646.
Прыпісная кніжка Абрамовіча Л. П., выд. Менакрваенкаматам, кв. 647.
Вучотна-конская карт. В. М. серыя 152; 2) вучотна конская карт. В. М. серыя № 1398, выд. 2-м вайскова-конскім вучасткам Аршанск. р-ну 3) асабовае пасьведчаньне № 83, выд. Аршанскім РВК на імя Задароўскага С. С. кв. 648.
Вучотна-конская кніжка Кучмеля І. Ф., выд. Астрап.-Гарадзецк. РВК кв. 649.
Вучотна-вайсковая кніжка Малашкевіча Д. С., выд. менакрваенкаматам, кв. 650.
Патэнт І-га разр. на шыцьцё ватных коўдраў, выд. менакрфа на імя Айзенштата кв. 651.
Пашпарт Ганчаровай Л. Ф., выд. менакрміліц, кв. 652.
Студэнцк. пасьведчаньне за № 3 і заліковая кніжка, выд. БДУ Станкевіча В. Я., кв. 653.
Біржавы талён Нехайчыка К. Л., выд. Менбіржай Працы, кв. 654.
Вайсковая кніжка Шумахера С. Г., выд. Менакрваенкаматам, кв. 655.
Конская карт. № 9069 Ходасава А. М. выд. Горацкім РВК, кв. 137-п.
Заліковая кніжка № 165 Забела А. М., выд. белар. с.-г. акадэм., кв. 137-п.
Заліковая кніжка № 138 Андруковіча З. А., выд. Белар. дзярж. унів., кв. 137-п.
Студэнцк. пасьведчаньне за № 361 Казачэнка М. Т., выд. Белар. с.-с. акадэм., кв. 137-п.
Студэнцк. пасьведчаньне за № 100 Клебанава З. С., выд. Белар. с.-г. акадэм., кв. 137-п.
Прыпісная кніжка Шаўцова С. К., выд. Чавускім РВК, кв. 137-п.
Пашпарт № 194 Автаняніча І. А., выд. Дубровенскім РВК, кв. 137-п.
Конская кніжка за № 717 Сеўніцкага Ф., кв. 137-п.
Асабовая кніжка Лучына Д. С., выд. Крупскім РВК. нараджэньня 1898 г., кв. 139-п.
Вайсковая кніжка № 54 Сеўніцкага нараджэ. 1888 г., кв. 137-п.
Пенсіонная кніжка № 393 Семянкова выд. Горацкай стракхасай, кв. 137-п.
Конская карт. Рамаванка З., выд. Смоленскай губ., кв. 137-п.
Асабовая кніжка № 158 Макарава А. выд. Баеўскім РВК, кв. 137-п.
Студэнцк. пасьведчаньне № 880 Прыбыкоўскага У., выд. Белар. с.-г. акадэм. кв. 137-п.
Конская карт. за № 375 Москалева выд. Горскім ВВК, кв. 137-п.
Камсамольскі білет за № 36831 Страмжаўскага П., выд. Акружк. арганізацыі ВЛКСМ, кв. 137-п.
Пасьведчаньне Лучына Ц. С., выд. лінейным паркам, нараджэ. 1900 г. кв. 139-п.
Паявая кніжка за № 984 Міркіна Х. І. выд. Крупскім спаж. т-вам, кв. 139-п.
Службовая кніжка за № 66 Шыкевіча Р. М., выд. Барысаўск. прыгарадн. каміс., кв. 139-п.
Пашпарт Шаніра Б. Я., выд. Крупскім РВК, кв. 139-п.
Вучотна-конская кніжка за № 658 Шаповава Д. Р., выд. Крупскім РВК кв. 139-п.
Пасьведчаньне аб пагодненасьці да вайсковай службы, выд. Барысаўскім ваенкаматам на імя Драніца А. П., кв. 139-п.
Паявая кніжка Харашука Ф. І., выд. Менскім спаж. т-вам „Сынчка“ за № 11 кв. 133 п.
Сяброўскі білет № 50513 Шэндзіка П. П., выд. Ленінградскім саюзам жэлезчавіёў, кв. 137-п.

Галоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня.